Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 САКАВІКА 2018 г. АЎТОРАК № 48 (28664)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як правільна выбраць сарты насення

СТАР. 5



Алег Ждан аб літаратуры і іншым

СТАР. 11



Сакрэты чэмпіёнкі па фітнес-бікіні

СТАР. 13

# Гаючая вада малой радзімы

Сталічны кіроўца Анатоль ДВАРЭЦКІ родам з вёскі Ануфравічы Слуцкага раёна і, калі наведвае родныя мясціны, абавязкова заглядвае на святую крыніцу, каб набраць вады — чысцюткай, смачнай, карыснай. Крынічны комплекс знаходзіцца за вёскай Пакрашава і пасля адкрыцця (гэта адбылося тры гады таму) стаў сапраўдным культавым месцам Случчыны, да крыніцы спяшаюцца і мясцовыя жыхары, і вандроўныя госці.

— Няма лепшай вадзіцы, чым з роднай крыніцы! — усміхаецца Анатоль Дварэцкі. — Калі крыніцу асвяцілі — я тут самы часты госць, набіраю поўныя бутлі і вязу іх у сталіцу.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**

*«Выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця — не самамэта. Галоўнае — стварэнне працоўных месцаў, дасягненне добрага ўзроўню заработнай платы. У гэтых пытаннях мясцовым органам улады варта праявіць большую актыўнасць. Мы бачым, што 30 % беспрацоўных — моладзь. Вельмі важна на гэтым этапе падтрымаць маладога чалавека, даць яму першы штуршок у жыцці. Адміністрацыя Прэзідэнта ўдзяляе сур'ёзную ўвагу пытанням занятасці. На гэта накіраваны і Дэкрэт № 1, у кожным горадзе будуць створаны спецыяльныя камісіі. Рэалізацыя гэтага дэкрэта дазволіць больш дзейсна вырашаць пытанні, якія датычацца занятасці. Мы бачым, што сітуацыя мяняецца ў лепшы бок».*

■ Як нас дураць

## ЯК НЕ КУПІЦЬ КАТА Ў СЕЦІВЕ

Парады тым, хто набывае тавар у інтэрнэце



**У віртуальных крам ёсць свае перавагі — тавар больш танны, можна рабіць пакупкі, не выходзячы з дому. Але не заўсёды пакупка бывае ў радасць. І апошнім часам такое здараецца ўсё часцей. Спецыялісты сведчаць, што кожная другая-трэцяя скарга ад насельніцтва менавіта на тавар з інтэрнэту. Старшыня магілёўскай грамадскай арганізацыі абароны спажыўцоў і член праўлення гэтай жа арганізацыі на рэспубліканскім узроўні Васіль ЧОРНЫ дае парады, як пазбегнуць непрыемнасцяў пры набыцці тавару ў Сеціве і што рабіць, калі яны ўсё ж такі ўзніклі.**

СТАР. 4

■ Агратурызм

## КУРЫЦА Ў ГАРБУЗЕ, ЗЯЛЁНЫЯ ГУЛЯНКІ ДЫ ВОДНЫЯ СПЛАВЫ

Калі малая радзіма ператвараецца ў крэатыўную прастору

**Усяго гадоў дзесяць таму які мы маглі прапанаваць адпачынак на вёсцы, асабліва ў халодны час? Усадзіць і абабраць, прабачце, абагрэць, у лепшым выпадку, арганізаваць рыбалку, паляванне.**

Канешне, можна было б і далей сядзець і галасіць: «А ў нас нічагусенькі няма, а хто да нас паедзе?» Але знайшліся апантаныя і крэатыўныя людзі, якія здолелі зрабіць сапраўдны пераварот у агратурызме. З'явіліся не толькі сядзібы, на базе якіх створаны музеі, ладзяцца разнастайныя фестывалі, конкурсы, квэсты, майстар-класы. Функцыянуюць цэлыя турыстычныя маршруты, насычаныя падзеямі і ідэямі, над якімі чаравалі гаспадары сядзіб, рамеснікі, музейшчыкі і нават школьнікі. І падчас падарожжа па так званых зялёных маршрутах вы сустрэнеце ў тым ліку варыянты для адпачынку, якіх не прапануюць больш нідзе ў свеце. Прычым «індустрыя ўражанняў» на вёсцы развіваецца з кожным годам. Турыста ўжо можна перадаваць як эстафетную палачку. І на кожнай кропцы, дзе затрымаецца, ён можа разлічваць і на гасцінны прыём, і на пазнавальна-забаўляльныя праграмы.

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПЕРАЕМНІКІ БАЯВОЙ СЛАВЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане з 25-годдзем. «Шмат гадоў у гарачай кропцы планеты савецкія вайскоўцы паказвалі шчыры прыклад вернасці і служэння Радзіме. Перажыўшы суровыя выпрабаванні, былыя аднапалчане з'ядналіся для захавання памяці аб мужнасці і гераізме нашых рабят, узаемнай дапамогі і падтрымкі. Вось ужо чвэрць стагоддзя ваш Саюз не дае забыць боль жорсткіх страт, нагадвае нам аб крохкасці і каштоўнасці міру», — гаворыцца ў віншаванні.

Таксама кіраўнік дзяржавы пажадаў моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Звяртаючыся да членаў Саюза, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Вашы згуртаванасць, сіла і ўпэўненасць варты пераймання. Маючы заслужаны аўтарытэт, вы ўносіце значны ўклад у захаванне адзінства і згоды ў грамадстве, выхаванне маладога пакалення, па праве лічыцеся пераемнікамі баявой славы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны».

# Эканамічная актывізацыя ідзе ў плюс

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам. Суразмоўцы закранулі і тэму прэзідэнцкіх выбараў, якія адбудуцца ў Расіі ў гэтую нядзелю. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падчас такой палітычнай кампаніі актывізуюцца не толькі грамадскія, але і эканамічныя працэсы. «У Беларусі таксама мы назіраем і адчуваем гэты пульс», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што галоўнае — гэты тэмп пасля выбараў падтрымаць. Паколькі Беларусь і Расія цесна звязаныя, такая эканамічная актывізацыя ідзе нам у плюс. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ёсць шэраг пытанняў, якія пасля выбараў неабходна абмеркаваць, напрыклад, у сферы ваенна-палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва. «Думаю, што фармат Саюзнай дзяржавы для гэтага падыходзіць, — дадаў Прэзідэнт. — Таму нам належыць абмеркаваць з вамі, якія актуальныя пытанні мы вынесем на разгляд Вышэйшага дзяржаўнага савета, і пагаварыць аб тым, калі прыкладна мы зможам яго правесці». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, калі атрымаецца, гэта магчыма зрабіць адначасова з візітам абранага Прэзідэнта Расіі ў Беларусь. Пры гэтым да пасяджэння неабходна, каб ведамствы і ўрады абедзвюх краін прапрацавалі адпаведныя пытанні. «Каб зноў не выносілася на ўзровень прэзідэнтаў тое, што павінны вырашаць міністры і іншыя члены ўрада».

Рыгор Рапота далажыў аб сфарміраваным парадку дня пасяджэнняў Савета Міністраў і Вышэйшага дзяржаўнага савета. Таксама на сустрэчы з журналістамі дзяржсакратар расказаў, што Аляксандр Лукашэнка падпісаў бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2018 год. На ВДС, на думку Рыгора Рапоты, можна будзе паглядзець на перспектыву, як у далейшым фарміраваць бюджэт з улікам, напрыклад, колькасці сумесных праграм, якая расце.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## ■ Гучная справа

# «Беларуськалій» акажа дапамогу сем'ям загінулых шахцёраў

**Аб гэтым паведаміў журналістам генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван ГАЛАВАТЫ, перадае БЕЛТА.**

«Работнікі знаходзіліся пад выкінутай рудой, побач з абсталяваннем. Як ні сумна, смерць настала імгненна, у долю секунды, калі адбылося абрушэнне даху. Усяго на рудніку працавала каля 150 чалавек, а ў напрамку, дзе адбылася аварыя, — 14 чалавек. Гэта горны ўчастак, які складаецца з некалькіх праходчых комплексаў», — адзначыў Іван Галаваты.

Гарнякоў шукалі больш за 30 гадзін, завалы разбіралі ўручную. У ноч з 10 на 11 сакавіка горнавыратавальнікамі з-пад завалу выцягнуты машыніст горных выемачных машын Максім Іваноў і горнарабочы ачышчальнага забою Дзмітрый Валькоў 1973 і 1985 гадоў нараджэння. Шахцёры загінулі. У іх засталіся жонкі, у Максіма Іванова — дзве дачкі, у Дзмітрыя Валькова — сын.

Здарэнне, як мяркуецца, звязана з асаблівымі геалагічнымі структурамі — мульдамі, у ядрах якіх пад вялікім ціскам змяшчаюцца газы, у тым ліку метан. Для ўстанаўлення дакладнай прычыны гібелі двух рабочых пры абрушэнні ў шахце ААТ «Беларуськалій» назначаны судова-медыцынскія экспертызы

■

# Сімвал грамадзянства

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ўручыла юным беларусам пашпарты

**Урачыстая цырымонія адбылася ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Традыцыйнае мерапрыемства прымеркавана да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які будзе адзначацца 15 сакавіка.**

Галоўныя героі акцыі — 14-гадовыя падлеткі. Дваццаць сем хлопцаў і дзяўчат прыехалі з розных куткоў Беларусі — ад Баранавіч да Полацка, каб атрымаць з рук кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай галоўны дакумент у іх жыцці. Удзельнікі акцыі ўжо даказалі, што з'яўляюцца годнымі прадстаўнікамі сучаснай моладзі. Сярод іх — актывісты БРСМ і БРПА, выдатнікі вучобы, юныя артысты, члены спартыўных камандаў, пераможцы навукова-практычных канферэнцый і прадметных алімпіяд.

Па просьбе журналістаў Наталля Качанава ўспомніла, як сама ўпершыню атрымала пашпарт:

— Раней такіх урачыстых мерапрыемстваў не было. Мы прыходзілі ў пашпартны стол, распісваліся і атрымлівалі дакумент. Вельмі радуюся, таму што з'явілася такая слаўная, добрая традыцыя, якая несумненна павінна працягвацца. Для маладога чалавека — гэта знакавы дзень, які ён запомніць на ўсё жыццё.

Цырымонія ўручэння дала старт Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечанай Дню Канстытуцыі. Святочныя мерапрыемствы будуць адбывацца з 12 да 15 сакавіка ва ўсіх рэгіёнах краіны. Удзельнікамі патрыятычнага праекта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі стануць пераможцы маладзёжнай эстафеты творчасці «Мая Беларусь. Мая будучыня». Падчас мерапрыемстваў яны прачытаюць уласныя вершы аб Радзіме. Галоўныя падзеі акцыі пройдуць таксама ў Камітэце дзяржаўнага кантролю, Савеце Рэспублікі і Канстытуцыйным судзе.



Фота БЕЛТА.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ■ Добрая навіна

# Рукамі кранаць, на канапах ляжаць

**Каля 200 працоўных месцаў будзе створана ў велізарным цэнтры тавараў для дома «Карусель», які толькі што адкрыўся ў Гомелі. Як адзначыў намеснік старшыні Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргей АНДРЭЕЎ, праект пачынаўся ўсяго год таму:**

— На гэтым месцы стаялі металічныя гаражы і былі зараснікі кустоўя. Інвестары змаглі ў кароткія тэрміны рэалізаваць праект «пад ключ». У Гомелі такі цэнтр, дзе комплексна сабрана ўсё для таго, каб з густам абсталяваць дом, першы. Добра, што каля дзвюх сотняў гамяльчан тут атрымаюць дастойную працу.

На плошчы ў 11 тысяч квадратных метраў сваю прадукцыю прадставілі каля 70 вытворцаў мэблі і элементаў дэкору з Беларусі і Расіі. Некаторыя брэнды з'явіліся ў Гомелі ўпершыню. Тут размешчана не толькі самая розная мэбля, але і прадметы інтэр'еру, тэкстыль, посуд... Гандлёвая зона мае фармат адкрытай прасторы, дзе наведвальнікам дазволена не толькі кранаць рукамі мэблю, але сядзець на ёй і нават ляжаць. Арганізатары абяцаюць, што сацыяльную значнасць будуць падтрымліваць самымі рознымі акцыямі для наведвальнікаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У НЕПАЛЕ РАЗБІЎСЯ САМАЛЁТ



У аэрапорце Катманду пры пасадцы разбіўся пасажырскі самалёт, паведаміла ВВС. Ахвярамі сталі як мінімум 40 чалавек. Самалёт бангладэшскай авіякампаніі US-Bangla выкаціўся з паласы пры пасадцы ў аэрапорце Трыбхуван і ўрэзаўся ў футбольнае поле, адбыўся выбух. Улады паведамілі ВВС, што ў самалёце было каля 67 чалавек і чатыры члены экіпажа. Вядома пра 17 эвакуяваных. Самалёт прыляцеў са сталіцы Бангладэш — Дакі.

## У ФЛАРЫДЗЕ НАСТАЎНІКАМ ДАДУЦЬ ЗБРОЮ

Кангрэс Фларыды прыняў законапраект, які дазваляе настаўнікам насіць зброю. Пакет мер накіраваны на прадухіленне трагедый, падобных расстрэлу ў Парклендзе. Адначасова ўведзена забарона продажу прылад, якія павышаюць скарастрэльнасць паўаўтаматычнай зброі.

## АМАЛЬ ТРЭЦЬ ВЕНЕЦЫІ ЗАТАПІЛА ПАСЛЯ ЛІЎНЯЎ

Моцныя дажджы прывялі да падтаплення 28 працэнтаў тэрыторыі гістарычнага цэнтра Венецыі. Мэрыя горада заяўляе, што шкоды і якіх-небудзь катастрафічных наступстваў непагадзь не пацягнула. Як паведаміў прэс-сакратар мэра Венецыі Алесандра Бертазі, узровень вады ў горадзе падняўся на 119 сантыметраў над узроўнем мора, але затым пачаў спадаць. Гэты паказчык лічыцца «дастаткова высокім». «Для нас такія з'явы не рэдкасць, але дзіўна, што гэта адбылося менавіта ў сакавіку», — заўважыў суразмоўнік агенцтва.



## ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ АЛЕГ ТАБАКОЎ

Народны артыст СССР, мастацкі кіраўнік МХТ імя Чэхава і «Табакеркі» Алег Табакоў памёр ва ўзросце 82 гадоў. Пра гэта паведамляе РІА Навіны са спасылкай на прэсслужбу МХТ імя Чэхава. Акцёр пайшоў з жыцця ў акружэнні сям'і ў бальніцы, дзе знаходзіўся некалькі месяцаў. У канцы снежня яго ўвялі ў штучную кому для таго, каб зняць нагрузку з унутраных органаў. Неўзабаве артыст прыйшоў у прытомнасць, але нікога не пазнаваў.

Табакоў вядомы па карцінах «Вайна і мір», «Сямнаццаць імгненняў вясны», «Дванаццаць крэслаў», «Д'Артаньян і тры мушкецёры», «Некалькі дзён з жыцця Абломава», «Масква слязам не верыць», «Чалавек з бульвара Капуцынаў». Яго голасам гавораць героі анімацыйных фільмаў «Бобік у гасцях у Барбоса», «Трое з Прастаквашына», «Канікулы ў Прастаквашыне», «Зіма ў Прастаквашыне» і «Вожык плюс чарапаха». У Табакова засталася жонка — актрыса Марына Зудзіна, а таксама чацвёра дзяцей.

Бывайце, Алег Паўлавіч...

## ■ Будзь у курсе!

# Пройдзе акцыя «Арсенал»

**ГУУС Мінгарвыканкама інфармуе, што з 19 да 23 сакавіка на тэрыторыі краіны будзе праходзіць спецыяльнае аператыўна-прафілактычнае мерапрыемства «Арсенал».**

Калі вы маеце інфармацыю аб фактах незаконнага абароту і захоўвання зброі, просьба паведаміць у найбліжэйшае аддзяленне міліцыі або па тэлефоне 102.

Як нагадалі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, грамадзяне, якія добраахвотна здадуць незарэгістраваную зброю і боепрыпасы, вызваляюцца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаілу Іванавічу Русаму ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю вядомага беларускага дзяржаўнага дзеяча і дыпламата Валянціна Уладзіміравіча ВЯЛІЧКІ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# ПАЭТ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВІНЦЫІ

**У выдавецтве «Харвест» працягваецца рэалізацыя кніжнага праекта «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры». Навінка — дакументальны нарыс Андрэя Мельнікава «Рыгор Барадулін: Паэт беларускай правінцыі».**

Лаканічны фармат аповеда, уважлівы разгляд усіх перыядаў жыцця і творчасці народнага паэта Беларусі Рыгора Іванавіча Барадуліна, трапныя характарыстыкі ў адносінах да найболей знакамітых і буйных твораў — усё гэта робіць кнігу досыць насычанай. А. Мельнікаў спрабуе правесці агледзіны не толькі жыцця, творчасці літаратара, але і прыўзняцца ў асэнсаванні яго, Рыгора Барадуліна, месца ў беларускай літаратуры, беларускім грамадскім і культурным жыцці. З кнігі можна даведацца пра стасункі паэта з нацыянальна-дэмакратычным рухам у канцы 1980 — у пачатку 1990-х, а таксама пра спробы вылучэння Рыгора Барадуліна на Нобелеўскую прэмію па літаратуры.

І ўсё ж шмат болей увагі ўдзяляе А. Мельнікаў повязі паэта з родным краем, родным домам, акрэслівае вытокі зацікаўлення літаратара роднай беларускай мовай. Падрабязна пералічвае настаўнікаў, якія самім ладам жыцця, самім вопытам свайго настаўніцтва былі прыкладам, давалі ўрокі і роднага слова, і павагі і любові да роднага. З цікавасцю чытаюцца старонкі, прысвечаныя самым блізкім людзям — маці і бацьку паэта.

Нарыс пра Рыгора Барадуліна — адна з дзясяткаў кніжачак папулярнай «харвестаўскай» серыі. Некалі яшчэ выдавецтвы «Полымя» і «Навука і тэхніка» выдавалі кнігі ў серыях пад агульнай назвай «Нашы славутыя землякі». Цяпер зрэдчас гэты «брэнд» падтрымлівае выдавецтва «Тэхналогія». А ў прынцыпе літаратуры, прысвечанай персаналіям айчыннай гісторыі, катастрафічна не хапае. Літаратуры масавай, разлічанай на шырокае кола чытачоў. Так што праект выдавецтва «Харвест» з яснай і зразумелай назвай «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры», заснаваны ў 2012 годзе, заслугоўвае павагі і шырокай прапаганды.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Надвор'е

# ТЫДЗЕНЬ ЦЯПЛА

## Праўда, у пятніцу сіноптыкі абяцаюць пахаладанне да мінус 10 градусаў

**У Беларусі на працягу чатырох дзён будзе досыць цёпла, але да канца тыдня рэзка пахаладае, і ў выхадныя чакаюцца маразы, паведамілі спецыялісты ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі, у асноўным дождж, якія будуць суправаджацца парывістым паўднёвым ветрам. Месцамі магчымы туман, на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература будзе 2—8 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца ад плюс 9 да плюс 14 градусаў. У сераду ўначы і раніцай пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы краіны, а ўдзень месцамі пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, месцамі з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаецца туман, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень будзе ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах да 10-11 цяпла.

Атмасферныя франты будуць гаспадарыць у нас і ў чацвер. Таму ўначы амаль паўсюдна, а днём месцамі, пераважна па паўднёвай частцы краіны, чакаюцца кароткачасовыя ападкі (дождж, які будзе пераходзіць у мокры снег). У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, па поўдні — 4-5 цяпла. Удзень прагназуецца ад нуля да плюс 7 градусаў.

**УВАГА!** *Потым у нас чакаецца рэзкая змена надвор'я. Услед за атмасфернымі франтамі на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць халоднае паветра са Скандынавіі. Да канца тыдня пахаладае. У пятніцу пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. На дарогах чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 2—8 марозу, па поўначы пры праясненнях да мінус 9-10 градусаў. Удзень будзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Толькі ў паўднёвых раёнах краіны ўначы будзе каля нуля, удзень — 3-4 цяпла.*

* * *

Паводле інфармацыі айчынных гідролагаў, у сувязі з цёплым надвор'ем на рэках Беларусі адзначаюцца палонкі, лёд на вадаёмах пацямнеў, стаў сітаватым і выходзіць на яго небяспечна. На рэках пераважае рост узроўняў вады з інтэнсіўнасцю 1—11 см за суткі. На асобных участках рэк узроўні вады перавышаюць адзнакі выхаду вады на пойму. На Прыпяці каля вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна ўзровень вады перавышае небяспечную высокую адзнаку на 4 см, тут адбываецца рост узроўню вады з інтэнсіўнасцю 3 см за суткі. Умовы надвор'я ў найбліжэйшыя дні будуць спрыяць раставанню ледзянога покрыва на рэках, структура лёду будзе мяняцца, павялічацца прасторы з адкрытай воднай паверхняй. На рэках будзе адзначацца ў асноўным рост узроўняў вады, у выніку чаго на Бярэзіне ў горадзе Беразіне і Сожы каля Слаўгарада вада выйдзе на пойму.

**Сяргей КУРКАЧ**

### У тэму

У Магілёўскай вобласці пад цяжарам снегу абрынуліся дахі ў двух будынках. Няшчасці адбыліся ў Быхаўскім і Кіраўскім раёнах. У Быхаўскім раёне без даху застаўся двухкватэрны жылы дом, дзе жывуць дзве пенсіянеркі. Абедзве жанчыны жывыя, прыезду ратавальнікаў чакалі на вуліцы. А ў Кіраўскім раёне на малочнатаварнай ферме таварыства «Кіраўскае райаграпрамтэхзабеспячэнне» на жалезабетонныя перакрыцці будынка скляліся шыфер і драўляныя латы на плошчы 180 квадратных метраў. На шчасце, тут таксама ніхто не пацярпеў. Учора на ферме поўным ходам ішлі аднаўленчыя работы.

— Гэта безгаспадарчасць і безадказнасць уласнікаў жылля і вытворчых памяшканняў, якія не паклапаціліся аб своечасовай ачыстцы дахаў, — лічыць **афіцыйны прадстаўнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вадзім УРУБЛЕЎСКІ.** — Мы пастаянна нагадваем пра тое, што трэба прыбіраць снег з дахаў, але не ўсе гэта чуюць. Тут усё залежыць выключна ад канкрэтных людзей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ На слыху

# Аляксандр Рыбак другі раз прадставіць Нарвегію на «Еўрабачанні»

## Нарвежац з беларускімі каранямі выйграў адкрыты тэлевізійны адбор

**На конкурсную сцэну ў Лісабоне выйдзе ўраджэнец нашай краіны, які ўжо выйграў «Еўрабачанне-2009» у Маскве з рэкордным на той момант вынікам у 387 балаў. Праўда, прадстаўляць ён будзе Нарвегію. Аляксандр Рыбак з бадзёрай кампазіцыяй «That's how you write a song» («Вось як вы пішаце песню») перамог у адкрытым нацыянальным тэлевізійным адборы, што фінішаваў 10 сакавіка.**


www.nrk.no

Нагадаем, абаяльны выканаўца, які паранейшаму не развітваецца з улюбёнай скрыпкай, некалькі гадоў таму спрабаваў свае сілы і ў беларускім адборы з дзявочым гуртам MILKI, выступаў як аўтар песень у нацыянальных адборах Мальты і Нарвегіі, аднак увайсці другі раз у конкурсную раку «Еўрабачання» спеваку ўдалося толькі цяпер. Між іншым, на сёлетнім нарвежскім адборы Melodi Grand Prix быў зафіксаваны новы рэкорд — 1200 заявак ад аўтараў і выканаўцаў, таму перамога Аляксандра Рыбака выглядае яшчэ больш пераканаўчай. Кіраўніцтва нарвежскага тэлебачання адзначыла высокі прафесійны ўзровень выканаўцы, а таксама пазітыўную рэакцыю на яго песню вялізнай арміі прыхільнікаў з краін Усходняй Еўропы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

■ На слыху

# ДВОЕ ЗАГІНУЛІ НА СНЕГАХОДЗЕ

**Следчыя праводзяць праверку па факце смерці двух жыхароў Мёраў, якія разбіліся на гэтым транспартным сродку.**

Па інфармацыі ўпраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці, 8 сакавіка некалькі жыхароў раённага цэнтра знаходзіліся ў вёсцы Блажкі, дзе ўжывалі спіртныя напоі. Каля 17 гадзін двое мужчын селі на снегаход і паехалі катацца. Транспартным сродкам кіраваў 28-гадовы ўладальнік. У якасці пасажыра ехаў яго 27-гадовы знаёмы. Праз некалькі гадзін яны не вярнуліся, на тэлефонныя званкі не адказвалі. Пазней іх целы знайшлі на полі паблізу аграгарадка Чарэсы, дзе снегаход перакуліўся пры перасячэнні меліярацыйнага канала, урэзаўшыся ў яго адхон. Ад атрыманых цяжкіх цялесных пашкоджанняў кіроўца і пасажыр памерлі на месцы здарэння.

Раніцай 9 сакавіка следчыя правялі дадатковы агляд месца трагедыі, прызначылі неабходныя экспертныя даследаванні, апыталі відавочцаў. Па інфармацыі ўпраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці, установлена, што траўмы атрыманы за адзін раз, смерць мужчын наступіла ад гэтых цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Па матэрыяле праверкі прызначаны судова-хімічныя экспертызы загінулых на наяўнасць наркотыкаў і псіхатропных рэчываў, а таксама этылавага спірту і яго сурагатаў, аўтатэхнічная экспертыза, якая ўстановіць тэхнічны стан снегахода. Праверка па факце аварыі працягваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЗАБІЎ СВАЮ МАЦІ, А ЦЕЛА СПАЛІЎ

**У Пінску здзейснена жудаснае злачынства. 40-гадовы сын забіў 75-гадовую маці. А цела яе, паводле папярэдняй версіі, паліў часткамі тры дні ў печы.**

Жанчына прапала ў пачатку лютага. Тыдзень таму яе сын звярнуўся ў міліцыю з заявай аб тым, што маці сабрала свае рэчы і пайшла ў невядомым кірунку.

Пры праверцы факта праваахоўнікі дапусцілі, што знікненне састарэлай жанчыны можа мець крымінальны характар. Пачалася распрацоўка тых, хто трапіў пад падазрэнне. Сын зніклай пенсіянеркі прызнаўся, што ў ходзе сваркі штурхануў маці, яна ўпала, ударылася галавой. Праз некалькі гадзін, калі зразумеў, што яна памерла, вырашыў пазбавіцца ад цела. Хоць ніхто не ведае, як усё было на самай справе.

Зараз праводзяцца ўсе неабходныя следчыя дзеянні. Па падазрэнні ў забойстве мужчына змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Сезон

# Адкрываецца паляванне на птушку

**З другой суботы сакавіка (10-е чысло) у Беларусі пачынаецца веснавы сезон палявання на птушыную дзічыну. Па другую нядзелю мая (13 мая) дазваляецца ружэйная здабыча пралётных гусей: шэрай, белалобай, гуменніка, канадскай казаркі, а таксама самцоў (качароў) качак: крыжанкі, чырвонагаловай і чубатай чэрнеці, чыркоў — свістунка і траскунка.**

Паляванне на гусей і качароў качак дазваляецца ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін. Спосабы палявання на гусей — з засады толькі са скрадка, на качароў качак — з засады толькі са скрадка з падзываннем, з дапамогай падсадной качкі (качак) і (або) вабіка (вабікаў) і чучала (чучал). Дапускаецца прымяняць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам. Пры перамяшчэнні да месца палявання і назад, а таксама ў забароненых час зброя павінна быць разраджана і зачахлёна. Для вышуку і падачы здабытай дзічыны можна выкарыстоўваць паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, лягавых, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак.

Агульная працягласць веснавога сезона палявання на гусей і качароў качак не можа перавышаць чатырох тыдняў (28 каляндарных дзён) запар у прадугледжаным правіламі дыяпазоне (у 2018 годзе — з 10 сакавіка па 13 мая). Канкрэтныя тэрміны ўстанаўліваюцца рашэннямі карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў.

На працягу ўсяго веснавага сезона захоўваецца забарона на ажыццяўленне палявання на гусі белалобую, гуменніка, шэрую, канадскую казарку, крыжанку, чырка-траскунка, чырка-свістунка, чэрнець чырвонагаловую, чэрнець чубатую на тэрыторыі асобных паляўнічых угоддзяў, межы якіх устаноўлены пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ад 01.07.2014 г. № 30. Пры незаконнай здабычы дзікай жывёлы, якая жыве ва ўгоддзях, дзе забаронена яе адабранне, нанесеная прыродзе шкода вылічаецца ў трайным памеры.

Як нагадалі ў дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у перыяд масавай веснавой міграцыі птушак значна ўзрастае магчымасць сустрэць падчас палявання рэдкіх, у тым ліку чырванакніжных, птушак. Варта памятаць: у выпадку незаконнай здабычы дзікай жывёлы, якая з'яўляецца ўзорам CITES або ўключана ў Чырвоную кнігу, шкода вылічаецца ў двайным або трайным памерах (адпаведна).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# ЦЫВІЛІЗАВАНЫ АНЛАЙН

## У МАРГ канстатуюць зніжэнне колькасці парушэнняў сярод інтэрнэт-крам

**За апошнія пяць гадоў беларускі рынак анлайн-гандлю павялічыўся ў 2,8 раза, а таваразварот у інтэрнэт-крамах павялічыўся ў 25,8 раза з 2010 года. Пра гэта расказала начальнік упраўлення аховы правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірына БАРЫШНІКАВА. Паводле яе слоў, за апошнія некалькі гадоў паралельна зніжаецца і колькасць парушэнняў сярод продажаў у Сеціве. Разам з тым, работы ў МАРГ яшчэ шмат, прычым не толькі з анлайн-гандлем у беларускім сегменце, але і з замежнымі інтэрнэт-прадаўцамі.**

### СЕЦІВАМ КІРУЮЦЬ ПРЫВАТНІКІ

Сёння 67,4 % беларусаў выкарыстоўваюць інтэрнэт, а 44 % жыхароў краіны там яшчэ і купляюць. Пры гэтым гандаль становіцца ўсё больш трансгранічным — купля тавараў ажыццяўляецца ў тым ліку і за мяжой. Як адзначыла Ірына Барышнікава, беларусы сёння часта купляюць у Кітаі (21 %) і ў Расіі (11 %). Паводле яе слоў, доля рознічных анлайн-продажаў сёння складае толькі 2,8 %. «Гэта пакуль няшмат, але мы бачым тэндэнцыю росту. Доля будзе расці. На 1 студзеня 2018 года ў гандлёвым рэестры зарэгістравана больш за 16 тысяч крамаў. Юрыдычным асобам належаць каля 48 %, а 51 % — ва ўласнасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэты бізнес сёння атрымаў сваё развіццё як прыватная форма», — адзначыла Ірына Барышнікава.

Сярод найбольш папулярных пакупак беларусаў яна назвала бытавую тэхніку, вопратку, абутак, спартыўны інвентар, тавары для аўто. У 2017 годзе прыкметна вырас попыт на дзіцячыя тавары (у 7,8 раза), на касметыку і парфумерыю (у 7 разоў), тавары для спорту і турызму (у 6,2 раза). Запчастак для аўто купілі ў пяць разоў больш за мінулы год, чым у 2016-м, прадуктаў харчавання — у 4,4 раза, кніг — 3,7 раза. Большая частка пакупак усё яшчэ робіцца на беларускіх інтэрнэт-пляцоўках. У МАРГ гэта звязваюць з псіхалагічнай перакананасцю жыхароў краіны ў тым, што такім чынам іх правы абаронены ў большай ступені.

### ПАРУШАЮЦЬ І ЗАМЕЖНІКІ

Па словах Ірыны Барышнікавай, у 2017 годзе масавых парушэнняў, якія былі зафіксаваныя 3-4 гады назад, у МАРГ не назіралі. «Я не хачу сказаць што яны абсалютна адсутнічаюць. Але сёння можна гаварыць, што інтэрнэт-крамы выконваюць патрабаванні заканадаўства», — адзначыла Ірына Барышнікава. Пры гэтым, на яе думку, асноўныя праблемы, з якімі сёння сутыкаюцца беларускія спажыўцы, звязаны з міжнародным анлайн-гандлем. «Гэта досыць агульныя праблемы. Напрыклад, непастаўка замоўленага тавару ў тэрмін, утойванне важнай інфармацыі, рэалізацыя няякаснага і «шэрага» тавару, утойванне інфармацыі аб прадаўцу. Работы ў рамках кантролю сёння яшчэ шмат», — дадала Ірына Барышнікава. Таксама яна адзначыла, што многія прадаўцы ўсё яшчэ ўхіляюцца ад разгляду прэтэнзій грамадзян, але гэтая праблема таксама вырашаецца. Сустракаецца і абарот прадукцыі, рэалізацыя якой абмежавана заканадаўствам.

### АБАРАНЯЦЬ СПАЖЫЎЦОЎ БУДУЦЬ ПА-НОВАМУ

Ірына Барышнікава таксама нагадала, што Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў» у хуткім часе некалькі зменіцца. Зараз праект паправак у закон рыхтуецца да другога чытання. Магчымым дадаткам у ім стане абавязак прадаўца пры вяртанні грошай спажыўцу, рабіць гэта ў той жа форме, у якой быў плацеж, калі не дамовяцца аб іншым. Таксама спажыўцу не трэба будзе прад'яўляць пашпарт пры скасаванні дамовы з прадаўцом, у выпадку, калі пры заключэнні дагавора такі дакумент не патрабаваўся. Плануецца павялічыць тэрмін гарантыйнага рамонту з 14 да 30 дзён пры ўмове, што спажыўцы згодны на гэта. Якія менавіта папраўкі ўвойдуць у абноўлены дакумент вырашаць у найбліжэйшай будучыні.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ЯК НЕ КУПІЦЬ КАТА Ў СЕЦІВЕ

### Пакрывала з дзіркай, тэлефон з несумяшчальнай карткай памяці

— Гэтая тэма стала для нас настолькі актуальнай, што сёлетняе свята — Дзень правоў спажыўцоў, якое адзначацца ўжо ў гэты чацвер, пройдзе пад знакам «Зробім лічбавыя рынкі справядлівымі і сумленнымі», — адзначае Васіль Чорны. — Людзі заказваюць тавар у інтэрнэце, а калі высвятляецца, што ён няякасны, не ведаюць, куды яго вяртаць. Таму Міжнародная канфедэрацыя таварыстваў спажыўцоў і вырашыла звярнуць на гэту праблему ўвагу.

Васіль Чорны «гартае» электронныя дасье на тых, хто звярнуўся ў магілёўскую арганізацыю па дапамогу.

— Вось паглядзіце, вельмі паказальны прыклад і зусім свежы, — паказвае ён адну з іскавых заяў.

Валянцін набыў па інтэрнэце ноўтбук за 670 рублёў. Але хутка тэхніка стала «зavісаць», працавала ўсяго па 20—30 хвілін. Прадавец параіў звярнуцца ў сэрвісны цэнтр для дыягностыкі і рамонту. І пачаліся блуканні па пакутах. Спецыялісты праз некалькі дзён вярнулі ноўтбук, паведаміўшы, што ніякіх праблем з ім няма. Але той працягваў «завісаць». Валянціну адмаўляліся верыць, і яму нічога іншага не заставалася, як зняць увесь гэты працэс на відэа. Толькі тады тэхніку зноў забралі, пераўсталявалі праграмнае забеспячэнне, пачысцілі сістэму ахалоджвання. Але нічога не змянілася. Чарговыя паходы ў сэрвісны цэнтр засталіся безвыніковымі. Пакупнік адправіў прадаўцу напісаную з дапамогай спецыялістаў з арганізацыі абароны спажыўцоў прэтэнзію, але тая вярнулася назад. Цяпер пытанне вырашаецца ў судзе.

Не пашчасціла з ноўтбукам з інтэрнэт-крамы і Мікалаю. Двойчы здаваў у рамонт з адной і той жа няспраўнасцю. Майстры займаліся ім амаль увесь гарантыйны тэрмін. Мужчына спадзяецца атрымаць грашовую няўстойку за маральны ўрон.

У спісе пацярпелых ад інтэрнэт-гандлю Віктар, якому папаўся няспраўны айфон. За кароткі тэрмін ён двойчы здаваў яго ў рамонт, збіраецца развітацца з нешчаслівай пакупкай і вярнуць грошы. Алене, якая таксама набыла айфон праз інтэрнэт, хапіла яго толькі на тое, каб зрабіць адзін здымак. Болей ён не ўключаўся. У сэрвісным цэнтры зрабілі заключэнне, што мабільнік ёй прадалі з несумяшчальнай флэш-картай.

**Толькі лічбы**

Летась па дапамогу ў магілёўскую арганізацыю абароны спажыўцоў звярнулася 9120 чалавек. З іх непасрэдна на прыём — 636. З дапамогай арганізацыі праведзена 93 экспертызы па таварах народнага спажывання.

Яшчэ прыклады? Жыхарка Магілёва купіла праз інтэрнэт садовы здрабняльнік. Тавар даставіў кур'ер, але правяраць яго не стаў і хуценька збег. Жанчына паспрабавала завесці агрэгат сама, але ён так і не запрацаваў. Сюрпрыз чакаў яшчэ адну магілёўчанку, якая заказала ў віртуальнай краме пакрывала. Атрымала ўжо яўна не новае, ды яшчэ з дзіркай.

### Скаргі ледзь паспяваюць прымаць

Васіль Чорны перыядычна адхіляецца ад нашай размовы з-за званкоў. «Трэснула падэшва? — пытаецца ён у трубку. — Карова захавалася? І чэк? Гэта добра. Звяртайцеся да прадаўца. Майце на ўвазе — 30 дзён — гэта гарантыйны тэрмін носкі абутку. А гарантыя на абутак, калі маюцца



вытворчыя недахопы, два гады. Калі прадавец адмаўляецца вярнуць грошы, прыходзьце да нас на экспертызу. Яна ў нас праводзіцца па серадах. Праз тыдзень будуць вядомыя вынікі, і вам вернуць грошы.

Не паспявае пакласці трубку, як зноў званок. «Кацёл цячэ? Выклікайце сэрвісны цэнтр, вам павінны зрабіць гарантыйны рамонт. Жадаеце, каб кацёл замянілі? Пішыце прэтэнзію, калі там такі недахоп, які нельга ліквідаваць».

Тэлефон упарта не жадае маўчаць. На лініі жанчына, яна ледзь не плача. Па стане здароўя не можа ехаць адпачываць, а ўжо аддала 200 рублёў перадаплаты. «Прыкладзіце да заявы копію выпіскі ад урача і прасіце скасаваць дагавор. У вас важкая падстава», — раіць спецыяліст.

За паўтары гадзіны прагучала, напэўна, з дзясятак такіх званкоў. Гэтыя выпадкі да інтэрнэту адносін не маюць. Але прымушаюць задумацца, бо дыстанцыйна падманулі яшчэ прасцей. Да ведама, асноўнымі парушэннямі ў сістэме інтэрнэт-гандлю з'яўляюцца наступныя: непастаўка тавару па аплачаным дагаворы, рэалізацыя няякаснага тавару або паслугі, не поўная інфармацыя аб прадаўцу, ухіленне ад разгляду патрабаванняў спажыўца, адмова ў пакрыцці страт і іншыя. Усё гэта падрывае аўтарытэт электроннага гандлю.

### Дасведчаны — значыць узброены

У перарыве паміж званкамі раблю спробы даведацца, чым арганізацыя дапамагае спажыўцам, што трапілі ў пастку.

— Перш за ўсё кансультацыяй, — кажа Васіль Чорны. — Прыходзіць чалавек і не ведае, што рабіць. Як тая бабуля з пакрывалам. Атрымала тавар на пошце, прынесла дадому, а там дзірка. Пачала званіць, а прадавец не адказвае. Я ў такіх выпадках заўсёды кажу: калі атрымліваеце рэч, вы павінны яе адкрыць і паглядзець. Калі тавар прывёз кур'ер, трэба перад тым як распісацца ў атрыманні пакупкі, праверыць. Не слухайце, калі чалавек, які даставіў яе, сцвярджае, што да здзелкі не мае ніякіх адносін. Маўляў, разбірайцеся з прадаўцом. Гэта — хлусня. Ён павінен не толькі прывезці, але адкрыць і праверыць. Калі тавар не працуе, вы маеце права адмовіцца ад яго і не плаціць грошы. А яшчэ не забывайцеся патрабаваць гарантыйны талон і чэк. Калі няма дакументаў, а пакупка не радуе, будзе вельмі праблематычна дамагчыся праўды. Першае, што трэба будзе ў такім выпадку зрабіць, напісаць прэтэнзію да прадаўца. Згодна з артыкулам 20 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», чалавек можа прэтэндаваць на замену няякаснага тавару якасным, або на бясплатны рамонт, або на памяншэнне кошту, а ў асобных выпадках наогул скасаваць дагавор і вярнуць грошы. Адказ павінен быць дадзены на працягу 14 дзён.

**Да ведама**

Толькі ў Магілёўскай вобласці працуе дзве гарадскія — Магілёўская і Бабруйская — і дзесяць раённых арганізацый, якія дапамагаюць спажыўцам абараняць свае правы. Ад Беларусі ў Міжнародную канфедэрацыю таварыстваў спажыўцоў уваходзіць толькі тры арганізацыі — непасрэдна Беларуская (рэспубліканская), а таксама Мінская і Магілёўская гарадскія.

Наогул у Законе даецца падрабязная інструкцыя, як адстойваць свае правы. Грамадзянска-прававая адказнасць прадаўца агаворваецца ў артыкуле № 16. Там сказана, што ён павінен даць спажыўцу поўную інфармацыю пра тавар. А таксама прыводзіцца парадак напісання прэтэнзіі. Дарэчы, парушэннем лічыцца нават, калі інфармацыя пра тавар даецца без перакладу на адну з дзяржаўных моў (артыкул 8).

Грамадскія арганізацыі абароны спажыўцоў дапамагаюць таксама праводзіць экспертызу абутку і адзення, пісаць іскавыя заявы, прэтэнзіі. І гэта пры тым, што асноўныя абаронцы правоў спажыўцоў усё ж такі не яны. Гадоў 10 таму па ініцыятыве Міністэрства гандлю ва ўсіх выканкамах была ўведзена пасада ўпаўнаважанага па абароне правоў спажыўцоў. У 43 артыкуле Закона напісана, што менавіта мясцовыя органы павінны разглядаць заявы і рэагаваць.

— Хоць часам трэба праявіць настойлівасць, каб гэтага дабіцца, — адзначае Васіль Чорны. — Усе лічаць, што мы павінны гэтым займацца, але артыкул 47 агаворвае, што мы толькі «маем права» аказваць такія паслугі. Пагадзіцеся, што розніца тут ёсць. Але мы нікому не адмаўляем. Нагадваем пра гэта толькі, калі вельмі нахабныя трапляюцца наведвальнікі. Маўляў, вы павінны мне дапамагчы, і кропка».

**Куды паскардзіцца**

Тэлефон «гарачай лініі» ў Магілёве — 8 (0222) 22-93-92, у Мінску — 8 (017) 322-19-05. Аддзел па кантролі за рэкламай і абароне правоў спажыўцоў Упраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама — 8 (017) 220-28-81. Гандлёвая інспекцыя Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь — 8 (017) 200-92-02.

### Не «вядзіцеся» на вельмі таннае

Усё вышэйсказанае ні ў якім разе не сведчыць пра тое, што ў інтэрнэце прадаюць спрэс няякасны тавар. Але, калі вам не пашчасціць, сапраўды могуць узнікнуць невырашальныя праблемы. Каб такога не здарылася, Васіль Чорны раіць прытрымлівацца восьі гэтых зусім нескладаных правілаў. Па-першае, не трэба купляцца на вельмі нізкія цэны. Звычайна якасць у такіх выпадках адпаведная. Па-другое, прадавец абавязкова павінен прадэманстраваць тавар у дзеянні і даць практычныя рэкамендацыі па правільным яго прымяненні. Па-трэцяе, не забывайцеся пра дакумент, які пацвярджае факт пакупкі, — чэк, квітанцыю, адрыўны талон або іншы дакумент, што яго замяняе. Па-чацвёртае, калі тавар тэхнічна складаны, патрабуйце пашпарт з інфармацыяй на ўласцівасці на рускай або беларускай мовах, завераны штампам аб продажы. Там жа павінен быць пазначаны адрас сэрвіснага цэнтра, куды трэба будзе звярнуцца ў выпадку паломкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*З этычных меркаванняў імёны людзей, якія мелі непрыемнасці пры набыцці тавараў у інтэрнэце, зменены.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# КАЛІ АГАРОД ПАЧЫНАЕЦЦА З ПАДАКОННЯ...

## Навукоўцы раяць, як вырошчваць расаду ў хатніх умовах

**На Захадзе вытворцы перцаў, баклажанаў і таматаў набываюць гатовую расаду ў спецыяльных комплексах, што займаюцца яе вырошчваннем. Не так проста стварыць для яе спрыяльныя ўмовы. Трэба прытрымлівацца пэўнай тэмпературы, забяспечваць святлом і да таго ж улічыць тэрміны так, каб яна «выспела» да моманту высадкі ў цяпліцы ці адкрыты грунт. Важна не перарасціць расаду. Але і «недагон» адаб'ецца на ўраджаі, мы нават можам яго і не дачакацца: пакуль расліны разаўюцца, ужо будзе канец лета.**

**Дык што трэба ўлічыць аматару, які хоча вырасціць добрую расаду ў хатніх умовах? Па парады выпраўляемся ў Інстытут агародніцтва НАН Беларусі.**

Зразумела, у першую чаргу трэба правільна падабраць насенне, бо, напрыклад, тыя ж сарты перцаў, што паспяхова вырошчваюцца на поўдні, у Беларусі з яе кароткім і не заўсёды цёплым летам могуць і не выспець.

— Селекцыя ў любой краіне вядзецца па занальных прынцыпах. Калі браць, напрыклад, таматы ці агуркі, у нашых умовах большменш прыстасаванымі будуць сарты польскія, цэнтральных рэгіёнаў Расіі. Сарты айчыннай селекцыі адрозніваюцца прыстасаваннем да ўмоў вырошчвання — у плёначных цяпліцах ці ў адкрытым грунце, — заўважае **загадчык лабараторыі паслёнавых культур кандыдат біялагічных навук Леанід МІШЫН.** — Важна ўлічваць і тып глебы ў сваіх гаспадарках, узровень агратэхнікі (як часта гаспадары будуць падсілкоўваць расліны, якія элементы выкарыстоўваць). Напрыклад, я глядзеў артыкул, створаны для нямецкіх агароднікаў. Там выкарыстоўваюцца іншыя ўгнаенні, прэпараты, якіх у нас наогул можа не быць. І іх сарты ў нашых умовах сябе будуць дрэнна адчуваць. У Амерыцы вельмі развітая вытворчасць таматаў, аматары ганяюцца за разнастайнасцю пладоў па колеры і форме. Але амерыканскія таматы ў нас у адзін год могуць даць добры ўраджай, а пасля на працягу трох-чатырох гадоў — правальны. Беларускія сарты, як кажуць, «зорак з неба не хапаюць», але стабільна па гадах даюць нядрэнны ўраджай.



Кулон.

Варта спыняцца на айчынных сартах і таму, што яны ўстойлівыя менавіта да нашых хвароб. Напрыклад, у Беларусі існуе другая раса кладаспарыёзу, якая практычна не сустракаецца ў Расіі і ў Польшчы. Толькі вырошчваючы наш сорт, можна атрымаць культуру, устойлівую да гэтага вельмі грознага захворвання, якое ў цяпліцы можа знішчыць таматы за тры-чатыры дні, а прэпаратаў па абароне ад яго яшчэ даволі мала.

Вялікая памылка — адразу садзіць шмат навінак. Так можна занесці многа хвароб, ад якіх пазбавіцца цяжка ці наогул немагчыма. Напрыклад, бактэрыяльны рак, які завозіцца з паўднёвых рэгіёнаў Еўропы, можа існаваць у глебе да 10 гадоў.

***— Часам агароднікі раюць адзін аднаму выкарыстоўваць больш старое насенне, маўляў, інфекцыя гіне пры працяглым захоўванні.***

— Гэта міф. Бактэрыя дае споры, якія могуць захоўвацца дзесяцігоддзямі. За той час, пакуль яна загіне, насенне страціць усходжасць. Так, цыбулю, салату можна захоўваць не болей за 2-3 гады, перцы, баклажаны, таматы — не больш як 3-5 гадоў, агуркі — 5-6 гадоў, а пастарнак наогул можа за год страціць пасяўныя якасці. Многае залежыць і ад умоў захоўвання насення, важна, каб не было рэзкіх хістанняў тэмператур і каб паветра заставалася сухім. Нават насякомыя заводзяцца ў ім толькі ў тым выпадку, калі яно мае нейкую ступень вільготнасці.

Не трэба забывацца і пра тое, што сарты тры-чатыры гады захоўваюць свае якасці, а гібрыды трэба набываць штогод. Існуе меркаванне, што, калі з апошніх сабраць насенне, з яго нічога не атрымаецца. Насамрэч гэта не так. Адзін з дзесяці гібрыдаў будзе на другі год даваць добры, цалкам прыстойны ўраджай. Але калі аўтары пры стварэнні сорту выкарысталі стэрыльную форму, то ў другім пакаленні на кожныя тры звычайныя расліны будзе выпадаць адна стэрыльная — бясплодная. Зразумела, можна рызыкаваць, эксперыментаваць, збіраючы сваё насенне, але мэтазгодней усё ж гібрыды набываць штогод, каб мець добры ўраджай.

***— Ці можна параіць для вырошчвання нявопытным агароднікам індэтэрмінантныя памідоры?***

— Для вырошчвання высакарослых таматаў трэба прытрымлівацца некалькіх умоў. Першае, што важна, — якасная расада павінна быць у стадыі бутанізацыі да моманту высадкі. Па-другое, на такіх раслінах трэба выдаляць усе пасынкі. Калі яны вырастаюць больш за сем сантыметраў, страчваецца ўраджайнасць. Калі наогул не займацца пасынкаваннем, замест нармальных памідораў вырасце гарох. Важны элемент — падкормкі асноўнымі элементамі (іх трэба зрабіць 3-4 за лета) і ўнясенне мікраэлементаў (раз на тыдзень апырскваннем па лістах у вячэрні час). Высакарослыя таматы даюць 10—15 кілаграмаў з метра квадратнага. Акрамя таго, яны больш працяглы час пладаносяць, а ў нізкарослых патэнцыял меншы, расліны раней пачынаюць пашкоджвацца.

Дэтэрмінантныя, ці нізкарослыя, памідоры патрабуюць меншага догляду і сілкавання, у любым выпадку нейкі ўраджай вы будзе мець. А калі не забудзецеся на падкормкі, ён будзе даволі вялікі.

***— Што трэба ўлічваць пры выбары грунтоў для пасадкі расады?***

— У мінулым годзе было шмат скаргаў на розныя грунты. Вытворцы не заўсёды захоўваюць якасць на належным узроўні. Можна было б парэкамендаваць торфагрунт «Дзвіна», у яго дадаюцца вапна, азот, фосфар, калій і нават мікраэлементы. І на першы час пры вырошчванні сеянцаў і расады сілкавання там хапае. Некаторыя дачнікі хочуць сэканоміць і дадаюць да торфу глебу з агародаў. Такая зямля можа змяшчаць вельмі многа інфекцый і расліны (насенне) могуць з-за гэтага загінуць. Таму калі і браць зямлю, то лепш з месца, дзе не раслі ні агародныя культуры, ні бульба. Гэта могуць быць лесапасадкі, лясныя масівы.

***— Калі насенне можа не ўзысці?***

— Прычын можа быць некалькі. Напрыклад, адсутнасць дэзінфекцыі. Калі насенне не афарбаванае і на ўпакоўцы не пазначана, што яго апрацавалі, на ім могуць быць інфекцыі, часам нават не асабліва агрэсіўныя. Але ў пакаёвых умовах, за трайным шклом (а зараз ва ўсіх стаяць шклопакеты) расліны аслабленыя, таму такая інфекцыя можа стаць небяспечнай. Найбольш распаўсюджаны спосаб дэзінфекцыі — у аднапрацэнтным растворы марганцоўкі (30 хвілін). Не разлічвайце на вока — часам людзі глядзяць, каб раствор быў слаба ружовага ці інтэнсіўнага колеру. Стандартны пакет 4 грамы трэба развесці на 0,4 літра вады. Далей насенне прамываюць і замочваюць у вадзе.

Прытрымлівайцеся тэмпературы — да з'яўлення масавых усходаў яна павінна быць 25 градусаў (для перцаў да 27). Калі яна вышэйшая ці ніжэйшая, гэта адаб'ецца на ўсходжасці насення. Можна побач пакласці звычайны бытавы тэрмометр.

***— Якая павінна быць кіслотнасць глебы, каб насенне ў ёй не загінула?***

— Для таматаў, перцаў і баклажанаў найбольш падыходзіць pH 6. Часта на пакетах грунтоў пазначаюць кіслотнасць ад 3 да 8, ад 4 да 7, гэта дазваляе прадаць любы грунт, і вы не зможаце выказаць ніякіх прэтэнзій. Звярніце ўвагу на тое, што змяшчаюць грунты. Пажадана, каб элементы харчавання — азот, фосфар, калій — былі прыкладна ў роўных суадносінах.

***— Якія асноўныя памылкі пры вырошчванні расады?***

— Важна ўлічваць розніцу дзённай і начной тэмператур. Аптымальныя ўмовы, калі днём 22—23 градусы, а ўначы 17—18. Можна рабіць дасвечванне (вечарам на 2-3 гадзіны), каб атрымаць добрую расаду. Зараз з'явілася многа лямпаў для акварыумаў, якія маюць спецыяльны спектр для раслін. Такія лямпы мы выкарысталі ў інстытуце, быў добры вынік. Важна прытрымлівацца стэрыльных умоў, не вырошчвайце расаду на кухні, дзе захоўваецца бульба, дзе паветрам можна занесці розныя інфекцыі. Вельмі добрыя вынікі, невытлумачальныя навукай, дае паліў расады і раслін у цяпліцы дажджавой, талай вадой. Яна валодае стымулюючымі здольнасцямі, расліны добра на яе рэагуюць.

***— Расада перарастае, а надвор'е, як, напрыклад, працяглая халодная вясна ў мінулым годзе, не дазваляе перасаджваць расліны ў парнік. Што зрабіць, каб запаволіць рост расады?***



Кінжал.



Майстар.

— Трэба рэзка паменшыць тэмпературы. Ні ў якім разе яе нельга зацяняць, эфект будзе толькі горшым. З біялагічных прэпаратаў, якія дазваляюць расадзе пасля высадкі ў адкрыты грунт ці цяпліцу лепш прыжыцца, карысным будзе эпін, апырсквайце расліны ў вячэрні (ці вельмі ранні) час, каб на іх не было апёкаў. Калі таматы перараслі, гэта не бяда. Яны садзяцца пад нахілам на любую глыбіню, даюць бакавыя карані. Калі расада недастаткова вырасла ці пажаўцела з-за паніжэння тэмператур, мы рэкамендуем прымяняць 0,2-працэнтны раствор мачавіны (карбамід). Гэты прыём вясной будзе добра стымуляваць рост і таматаў, і перцаў, і баклажанаў. Праз тыдзень пасля пасадкі трэба зрабіць падкормку комплексным угнаеннем. Не трэба баяцца ўгнаенняў. Расліна — не чалавек, усё без разбору не есць, выбірае толькі тое, што ёй трэба, астатняе застаецца ў глебе. Вось чаму рэкамендуецца праз 4-5 гадоў выкарыстання мяняць размяшчэнне цяпліц.

***— Якія самыя распаўсюджаныя захворванні раслін?***

— Перш за ўсё — фітафтора. Змагацца з ёй у цяпліцы дастаткова проста. Можна выкарыстоўваць правераныя прэпараты, якія не пранікаюць унутр раслін, — гэта біялагічны прэпарат фітаспарын, бардоская сумесь і азафос палепшаны. Наносіць іх трэба зверху і знізу ліста. У апошнія гады ў сувязі з ранейшай актывізацыяй фітафтарозу (што звязана з вырошчваннем ранняй бульбы) у цяпліцах і адкрытым грунце мы рэкамендуем першыя апрацоўкі рабіць, калі плады таматаў дасягнуць аднаго сантыметра ў дыяметры. Што датычыцца кладаспарыёзу, фузарыёзу, тут трэба набываць устойлівыя сарты. Нашы высакарослыя сарты якраз вызначаюцца ўстойлівасцю да гэтых захворванняў.

***— На якія сарты агароднікам трэба звярнуць увагу, калі яны пойдуць па насенне?***

— З новых я парэкамендаваў бы гібрыд перца Майстар, які спалучае ранняспеласць, прадукцыйнасць, мае дастаткова тоўстую сценку — 5-6 міліметраў; у гібрыда Кінжал буйныя конусападобныя плады ярка-жоўтага колеру. У нас раянаваны два сарты баклажанаў Пацеха і Кулон (апошні мае гронкавы спосаб цвіцення, калі ў пазусе знаходзіцца не адна кветка, а некалькі), калі іх няма ў продажы, лепш выбіраць гібрыды. Многія сарты баклажанаў, якія сёння прадаюцца, паходзяць з паўднёвых рэгіёнаў і ў нашых умовах будуць пакутаваць з-за недахопу цяпла. З высакарослых таматаў вартыя ўвагі Вежа і гібрыд Камфорт, з сярэднярослых — гібрыд Бум. З нізкарослых скараспелых рэкамендуем Пажар, Агат, Ізумруд, яны адрозніваюцца добрым насычаным смакам, знаёмым нам з дзяцінства. У новых сартах гэтага можа і не быць. З ультраранніх таматаў назавём Ліпень з пладамі 50—60 грамаў, што добра для цэльнапладнага кансервавання, і Кроху з пладамі па 2 сантыметры, іх зручна фасаваць у дробную тару. У крытычных умовах мінулага года пры нізкіх начных тэмпературах Кроха сябе добра адчуваў нават у адкрытым грунце. Сорт не патрабуе пасынкавання. Кусты яго невялікія, і гэта адзін з самых ранніх таматаў, што створаны ў нас і нашых суседзяў.



Бум.



Камфорт.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Фота Леаніда МІШЫНА.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Советское» (продавец) извещает о проведении 13 апреля 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Прицеп тракторный, модели ПСЕ-Ф-12, 5Б (инв. № 74 по бух. учету),** 1996 г. в. по техническому талону серии ЕА № 0014494, принят на бух. учет в 1998 г., **рег. № ЕА 0982**, заводской № 076789, состояние – технически исправен, на ходу | **366,01** | 36,60 |
| 2 | **Трактор МТЗ-80, марка двигателя – Д 243 (инв. № 86 по бух. учету), 1998 г. в., рег. № ЕА 1468**, заводской № 08001606, состояние – технически исправен, на ходу | **3777,56** | 377,76 |
| 3 | **Автомобиль ГАЗ (GAZ) 32213 (инв. № 259 по бух. учету), 2002 г. в., рег. № ЕВ 6092**, цвет – сине-зеленый, тип ТС – автобус вагонной компоновки, состояние – технически исправен, на ходу | **1535,52** | 153,55 |
| 4 | **Автомобиль МАЗ (MAZ) 533702 ПМС-328 (инв. № 955 по бух. учету), 2003 г. в., рег. № ЕС 2853**, цвет – светло-серый, тип ТС – грузовой специальный подъемник гидравлический, состояние – технически исправен, на ходу | **5861,52** | 586,15 |
| 5 | **Автомобиль ГАЗ (GAZ) -3102 (инв. № 971 по бух. учету), 2003 г. в., рег. № 1044 АЕ-3**, цвет – светло-серый металлик, тип ТС – легковой специальный седан, состояние – технически исправен, на ходу | **2039,89** | 203,99 |

**Продавец:** КЖРЭУП «Советское», г. Гомель, пр-д Геофизиков, 4. Конт. тел.: 8 (0232) 42-17-02, 8 (044) 783-33-09 (life) – Климова Наталья Александровна, 42-38-31 – Филипченко Игорь Александрович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Советское»):** р/с BY57 BLBB 3012 0400 0796 7200 1001 в Гомельской Дирекции ОАО «Белинвестбанк», код банка BLBBBY2X, УНП 400079672, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1. **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 марта 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11 апреля 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Примечание: стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ). Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов, тел.: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – gomeloblreklama.by в разделе «Аукционы»**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
## о повторных торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего должнику Ярец Максиму Леонидовичу.

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот № 1, объект: Легковой автомобиль.

Наименование, начальная цена, местонахождение: Легковой автомобиль ВОЛЬВО 440, 1988 года выпуска, рег. знак 1508ЕС3 в количестве 1 шт., начальная цена – 431,20 бел. руб., местонахождение – г. Орша, 2-й пер. Коммунальный, 2.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб.12; 4 апреля 2018 г. в 10:00.

Справочная информация: Ильмухин Артур Сергеевич, судебный исполнитель, тел.: 8 (0216) 54-32-12, 8 (033) 399-83-26, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты: opi217@minijust.by

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 2 апреля 2018 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № BY22AKBB36429030007942200000, филиал № 215 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

УНП 300002505

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ПУТЕШЕСТВИЕ В ЧИСТОТУ!»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (далее – Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 590828925.

Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, аг. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Путешествие в чистоту**».

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

16.03.2018 г. – 30.06.2018 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», руководитель отдела маркетинга.

Члены комиссии:

1. Стасюк Евгений Владимирович, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по рекламным коммуникациям.
2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.
3. Драневич Наталья Николаевна, ООО «ЗападХимИнвест», юрисконсульт.
4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Persil», «Losk», «Пемос», «Vernel», «Deni», «Е», «Ласка», «Bref», «Pril», «Somat», «Пемолюкс», «Clin», реализуемой в дискаунтерах «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 16 марта 2018 года по 15 апреля 2018 года включительно:

1. Совершить покупку продукции торговых марок «Persil», «Losk», «Пемос», «Vernel», «Deni», «Е», «Ласка», «Bref», «Pril», «Somat», «Пемолюкс», «Clin» на сумму 15 рублей и более в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
2. Получить у кассира магазина оригинал и копию кассового чека, а также анкету участника и заполнить ее, указав:
   - фамилию, имя, отчество;
   - возраст (полных лет);
   - город;
   - телефон для связи с указанием кода города, либо кода мобильного оператора;
   - почтовый адрес, индекс;
3. Прикрепить копию чека к анкете.
4. Вернуть заполненную анкету с прикрепленной копией чека кассиру магазина.

К участию в Розыгрыше не допускаются лица, не указавшие свои ФИО, возраст, город, телефон для связи с указанием кодов, почтовый адрес и индекс, и не приложившие копию чека.

Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

Участнику необходимо сохранить оригинал кассового чека вплоть до окончания рекламной игры.

Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, отсутствие копии чека, которая должна быть приложена к анкете, или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете с прикрепленной копией чека.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз, каждый раз заполняя анкету участника.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 35 164,97 (тридцать пять тысяч сто шестьдесят четыре) рубля, 97 копеек с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сертификат подарочный на туристические услуги ОДО «ИНТЕРСИТИ» (срок действия до 14.02.2019 г.) | 1 | 5000 | 5000 |
| | и денежное вознаграждение | 1 | 728,9 | 728,9 |
| 2 | Смартфон Apple Phone X 64GB Space Grey (Demo), model A1901 3D068Z/A | 5 | 2790,00 | 13 950,00 |
| | и денежное вознаграждение | 5 | 398,67 | 1993,35 |
| 3 | Стиральная машина Zanussi ZWSG7101V | 20 | 555,00 | 11 100,00 |
| | и денежное вознаграждение | 20 | 64,7 | 1294,00 |
| 4 | Наборы бытовой химии, включающие следующие продукты: «Losk» – средство моющее синтетическое 4500 г. Сенсетив Актив-Займ 6. Нежность Ромашки. «Persil» – средство моющее синтетическое универсальное 4500 г. 360 градусов Комплит Солюшн Колор. Свежесть вернеля. «Vernel» – кондиционер для белья 910 мл. Свежесть Прованса. Концентрированный. «Ласка» – средство для стирки жидкое 3000 мл. Цвет (восстановление 3D) | 30 | 36,624 | 1098,72 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 3 мая 2018 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 15, комната переговоров.

**9.1.** Порядок проведения розыгрыша.

Для проведения розыгрыша используется лототрон и анкеты участников.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышных анкет получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из лототрона.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы, будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 21 мая 2018 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и оригинала кассового чека на покупку товаров, по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, с 7 мая по 30 июня 2018 г. с 10.00 до 16.00 (с понедельника по субботу включительно).

Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза, или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза) победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 21.05.2018 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3220 от 06.03.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **складского сооружения,** инв. № **600/С-137914** общей площадью **1551,7 кв. м,** расположенного на земельном участке с кадастровым номером **623680600001000563** площадью **0,3953 га** по адресу: **Минский район, Боровлянский с/с, 22, район д. Малиновка** (далее – объект). *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: зона санитарной охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения – водозабор Боровляны, площадью 0,3953 га; охранная зона линии электропередачи, напряжением до 1000 В, площадью 0,0398 га.* Сооружение пострадало в результате пожара.

<u>**Условия продажи:**</u>

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 150 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 % от начальной цены (15 000,00 бел. руб.), перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **18.04.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.04.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

■ Пытанне рубам

# ВАКОЛ ЯЙКА

## Чаму «сырыя» маладыя спецыялісты ў птушкагадоўлі?

**Барыс ЗІНЧУК, можна сказаць, аксакал у галіне айчыннай птушкагадоўлі. На Салігорскай птушкафабрыцы Барыс Іванавіч ужо сорак гадоў, у тым ліку трыццаць на пасадзе дырэктара. Менавіта пад яго кіраўніцтвам прадпрыемства атрымала далейшае развіццё і прызнанне адным з флагманаў краіны па вытворчасці яек. Нядаўна за шматгадовую добрасумленную працу, за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці кіраўнік удастоены найвышэйшай дзяржаўнай узнагароды — медаля «За працоўныя заслугі». Карэспандэнт «Звязды» пабывала на адной з найлепшых птушкафабрык краіны і пацікавілася, як удалося вывесці яе на такі ўзровень.**



Сёлета на фабрыцы ўвялі ў дзеянне птушнік для ўтрымання перапёлак на 400 пасадачных месцаў — дадаткова да тых 240, што былі створаны раней. Планка, якую намеціў калектыў па вытворчасці перапяліных яек, будзе залежаць ад попыту: колькі змогуць прадаць, столькі і будуць выпускаць. Наогул жа магчымасці птушкафабрыкі — 100 млн яек у год.

— Але столькі перапялінай прадукцыі на ўнутраным рынку прадаць не зможам, — кажа Барыс Зінчук. — Таму працуем з Расіяй. Аб'ёмы для паставак нарошчваем паступова. Мінулы год атрымалі каля 40 млн яек, сёлета плануем павялічыць іх вытворчасць як мінімум у паўтара раза.

Салігорскія птушкаводы першымі ў краіне пачалі прывіваць культуру ўжывання перапяліных яек. З цягам часу заўважылі цікавасць спажыўцоў да гэтага прадукту і па меры таго, як павялічваўся збыт, адпаведна павялічвалі і аб'ёмы вытворчасці. Расіянам усё больш даспадобы гэтая прадукцыя. Прычым не толькі сырое перапялінае і курынае яйкі, але і марынаванае, вэнджанае. Калі ў Беларусі за мінулы год рэалізавалі 3 млн яек, то ў Расіі ў дзесяць разоў больш. Яйкі марынаваныя як найлепш падыходзяць для пунктаў хуткага харчавання. Яны паскараюць працэс прыгатавання страў. Але айчынныя кухары, кандытары не знаходзяць гэтаму прадукту шырокага прымянення, не ствараюць пад яго новыя рэцэпты страў. Нашы суседзі ў гэтым плане ідуць наперадзе.

На прадпрыемстве самы нізкі расход кармоў на адзінку прадукцыі сярод аналагічных птушкафабрык. Барыс Іванавіч лічыць, што ў гэтым заслуга новага заатэхніка, які прафесійна падыходзіць да кармлення птушкі. А гэта дазволіла зменшыць сабекошт прадукцыі, што ў сваю чаргу паўплывала на яе канкурэнтаздольнасць. «Сёння ідзе барацьба за рынкі збыту. Яна можа весціся рознымі спосабамі: зніжэнне сабекошту, адпускной цаны, павышэнне якасці прадукцыі. Гэтыя складнікі павінны быць увязаны паміж сабой. Прычым змяншаць адпускныя цэны бязмежна недапушчальна: фабрыка проста не выжыве. Барацьбу за рынак трэба весці цывілізавана, не адміністрацыйнымі і сілавымі метадамі, а менавіта за кошт якасці», — лічыць мой суразмоўнік.

*— Барыс Іванавіч, зыходзячы з вашага меркавання, сцвярджанне, што кадры вырашаюць усё, не састарэла.*

— У айчыннай птушкагадоўлі кадравы голад. Калісьці ў аб'яднанні «Птушкапрам» была наладжана добрая сістэма падрыхтоўкі кадраў для галіны. Іх не проста вучылі, але і строга экзаменавалі. Цяпер тых спецыялістаў няма. Замест іх прыходзяць новыя, так бы мовіць «сырыя». У нас выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў непасрэдна на вытворчасці «вядзе» «старая гвардыя», якую мы захавалі. Гэта спецыялісты з вопытам, моцным багажом ведаў, які яны атрымалі ў свой час ад настаўнікаў. Калісьці ў Горацкай сельгасакадэміі была спецыялізацыя «Птушкагадоўля», затым яе закрылі. Сёння аднавілі, але ўзнікае пытанне: хто выкладчыкі? Гэта не практыкі, а тэарэтыкі, якія папаўняюць прафесійныя веды на аснове састарэлых кніг, таму што новыя пакуль не напісаны. А тым часам тэхналогіі рушылі наперад. Выкладчыкі павінны ўяўляць, што адбываецца на вытворчасці: няхай яны прыязджаюць, глядзяць, вучацца, знаёмяцца з тэхналогіямі, якія мы пастаянна ўдасканальваем. Пра гэта ў падручніках не пішацца. Цяпер многія пракладваюць шлях, які аказваецца не заўсёды, мякка кажучы, апраўданым: высокі сабекошт прадукцыі, нерацыянальныя расходы. У выніку з бюджэту даводзіцца выдаткоўваць значныя сродкі асобным птушкафабрыкам, таму што яны не ў стане сябе ўтрымліваць. Мы ні ў кога не бяром грошай: развіваемся, будуемся, набываем новае сучаснае абсталяванне, вядзём пашыранае ўзнаўленне вытворчасці і рухаемся наперад.

На думку Барыса Зінчука, павінна быць цесная сувязь навукі з вытворчасцю: «Мы можам прапанаваць сваё прадпрыемства як базавае: для гэтага ў нас ёсць усе ўмовы. І не трэба нам бюджэтных грошай на розныя эксперыменты. Мы любім эксперыментаваць. Напрыклад, для птушак распрацоўваецца розны рацыён. Затым параўноўваем эфектыўнасць, колькасць сабраных яек. У нас высокатэхналагічная сістэма ўліку вынікаў эксперыментаў».

Калі Барыс Зінчук узначаліў прадпрыемства, тут выпускалі 34 млн яек у год, сёння такую колькасць атрымліваюць за паўтара месяца. Удалося гэтага дасягнуць дзякуючы новым тэхналогіям. На адных і тых жа плошчах значна павялічылі колькасць птушкі. Купілі новыя больш прадукцыйныя кросы птушкі. Калі раней ад курыцынясушкі атрымлівалі ў год 268 яек і лічылі, што гэта рэкорд, то сёння збіраюць па 325 штук ад кожнай.

Сёння ў Беларусі выпускаецца 32 % яек звыш неабходнага аб'ёму, які могуць спажыць беларусы. Гэтыя лішкі экспартуюцца. Не таму, што вытворцы змагаліся за знешні рынак. Проста не змаглі прадаць прадукт унутры краіны. На жаль, экспарт сёння стратны, за межамі краіны яйкі рэалізуюцца па астаткавым прынцыпе.

*— У такім разе ўзнікае пытанне: ці патрэбны стратныя птушкафабрыкі і ці варта павялічваць выпуск прадукцыі, калі гэта нямэтазгодна?*

— Гэта так. Калі такое будзе працягвацца, што цалкам магчыма, бо кожны стараецца павялічваць аб'ёмы вытворчасці — патрабаванне часу і, мабыць, законаў эканомікі, то адпаведна будзе ўзрастаць і экспарт. У выніку ў цэлым у птушкагадоўчай галіне не будзе страт. Але такую сітуацыю можна параўнаць з сярэдняй тэмпературай па шпіталі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**У айчыннай птушкагадоўлі кадравы голад. Калісьці ў аб'яднанні «Птушкапрам» была наладжана добрая сістэма падрыхтоўкі кадраў для галіны. Іх не проста вучылі, але і строга экзаменавалі. Цяпер тых спецыялістаў няма. Замест іх прыходзяць новыя, так бы мовіць «сырыя».**

# КУРЫЦА Ў ГАРБУЗЕ, ЗЯЛЁНЫЯ ГУЛЯНКІ ДЫ ВОДНЫЯ СПЛАВЫ




## Гатуем сваё!

Сёння мала эксплуатаваць тэму гісторыка-культурнай спадчыны — на адных экскурсіях турыста доўга ў пэўным рэгіёне не затрымаеш. Але можна прыдумляць розныя формы, як тую ж гісторыю і традыцыі падаць. Так, у Зэльве ладзіцца Ганненскі кірмаш з тэатралізаванымі выступленнямі, конкурсамі, гулянямі. Між іншым, пару стагоддзяў таму гэтыя мясціны былі вельмі папулярныя ў заморскіх купцоў, сюды на конны кірмаш з'язджаліся з усёй Еўропы. Таму ў гарадскім пасёлку нават з'явіўся музей, прысвечаны згаданай тэме.

У раёне ладзіліся зялёныя гулянкі (экафестывалі), а сярод апошніх распрацовак для турыстаў — цэлая праграма «Свежаніна ў Міхася», дзе гасцям расказваюць і пакажуць, як разбіраць свінчо, рабіць з яго розныя смачныя стравы. Між іншым, менавіта кулінарнымі традыцыямі, у першую чаргу, можа пахваліцца раён. У аграгарадках — кожны месяц праводзяцца святы «клубніц», «малака», «каладзежа». Але асабліва трэба адзначыць конкурс «Гатуем сваё», калі журы са страў, прапанаваных мясцовымі гаспадынямі, абрала топ-9, сярод якіх курыца ў гарбузе, бульбяныя камы з грыбамі, галышы па-беларуску, каўдык, пызы па-галынкаўску. Яны будуць занесеныя на гастранамічную карту раёна, і плануецца, што адзін раз на месяц будуць падавацца ў раённых рэстаранах, аграсядзібах.

Да справы па зборы інфармацыі пра традыцыйную спадчыну прычыніліся і мясцовыя школьнікі. У экспедыцыях хлопцы і дзяўчаты з Князеўскай школы высвятлялі, як праходзілі старыя абрады, фатаграфавалі ўнікальныя аб'екты, што захаваліся ў раёне, запісвалі старадаўнія рэцэпты. У выніку з'явіліся кулінарныя брашуркі, краязнаўчы каляндар, адметна аформленая фотавыстава. Папаўняюся экспанатамі школьны музей. Невыпадкова Князеўская школа стала адной з тых самых кропак турыстычнага маршруту «Зэльвенскі дыяруш», дзе гатовы прыняць турыстаў, прычым, пры папярэдняй дамоўленасці, вы зможаце тут нават пакаштаваць стравы, прыгатаваныя па рэцэптах, сабраных у экспедыцыях.

У аграсядзібе «Сад маёй мары» госці змогуць паўдзельнічаць у міні-квэстах і майстар-класах па прыгатаванні «зэльвенскіх смузі». Гаспадар «Старой весі» запрашае на экскурсіі на пчаліную пасеку, у музей насякомых, падзеліцца, як лавіць начных матылёў на святло. А разам з супрацоўнікамі Дома рамёстваў можна навучыцца рабіць адмысловыя сувеніры.

Можна яшчэ доўга пералічваць цікавінкі, якімі напоўнены маршрут «Зэльвенскі дыяруш», але лепш прыязджайце сюды адпачываць — сапраўды будзеце ўражаны, як незвычайна можна правесці час нават у самым маленькім раёне Гродзеншчыны. А каб зручней было арыентавацца на маршруце, для вас падрыхтавалі пашпарт турыста, у якім сабрана інфармацыя пра найбольш цікавыя аб'екты Зэльвеншчыны.

## Валожыншчына прапануе...

Гістарычныя факты, на якіх можна закруціць сюжэты экскурсій, фестываляў, фэстаў знойдуцца ў кожным раёне, — упэўнены ўдзельнікі круглага стала, арганізаванага грамадскай арганізацыяй «Адпачынак у вёсцы». Але яны заўважылі, што, нават калі не кранаць тэму гісторыка-культурнай спадчыны, заўсёды можна прыдумаць, чым заняць турыстаў. Яскравы прыклад таму — зялёны маршрут «Валожынскія гасцінцы».

Так, адзін з першых вяровачных гарадкоў з'явіўся менавіта тут. Ідэю малпалэнда ўпадабалі адразу не толькі турысты, але і прадстаўнікі розных устаноў, аграсядзіб па ўсёй Беларусі.

Самая буйная (300 кіламетраў) маркіраваная сетка веламаршрутаў зноў жа пачала дзейнічаць на Валожыншчыне. Інфармацыю пра яе можна знайсці на розных сайтах, а таксама гэтыя веламаршруты нанесены на карту.

Актыўна развіваецца тут і конны турызм, прычым пры жаданні цікавыя падарожжы на конях вам могуць арганізаваць як на адзін дзень, так і на чатыры-пяць.

Агульны прыватны флот Валожынскага раёна — адзін з самых моцных у краіне. І калі гадоў з дзесяць таму толькі адзінкі сплаўляліся па рэках раёна, цяпер водных турыстаў у летні час тут тысячы. Уладальнікі нематорных лёгкіх лодак дамаўляюцца паміж сабой аб цэнах, таксама гаспадары аграсядзіб кааперуюцца ў пытаннях арганізацыі адпачынку і пражывання турыстаў. І сёння Валожыншчына здольная прыняць турыстаў з любымі запатрабаваннямі — можна спыніцца хоць у кемпінгу, хоць у салідных апартаментах.

Таксама тут плануюць развіваць лыжны турызм, скандынаўскую хаду, якая сёння вельмі папулярная ў свеце...

І гэта мы не згадалі пра разнастайныя фестывалі на адкрытым паветры, анімацыйныя праграмы, батлейку, кірмашы і майстар-класы (сярод апошніх заняткі па вырабе музычных інструментаў, выпечцы хлеба, гравіроўцы на шкле).

І зялёныя маршруты працягваюць развівацца, нягледзячы на тое, што яны ўжо ўражваюць сваім «зместам». Людзі, якія сёння ўцягнутыя ў агратурызм, кожны год ламаюць галаву над тым, чым бы яшчэ насыціць адпачынак у вёсцы. А ці не ў гэтым сакрэт поспеху?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Радавод

# СЯМЕЙНАЕ ЯК КУЛЬТАВАЕ

**ФОТАПРАЕКТ «Родны склон», які цяпер экспануецца ў сталічным Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва, — з'ява вельмі цікавая. Сутнасць яе ў тым, што вядомыя айчынныя фотамайстры на сваіх работах на гэты раз прадставілі... уласныя сем'і. Адно з пытанняў, якое цікавіла куратараў выстаўкі, — як будуць выглядаць работы майстроў, калі яны фатаграфуюць нешта звыклае, штодзённае?.. Ці даводзецца ім захоўваць пэўную дыстанцыю ад аб'екта здымкі? Якія мастацкія вартасці будуць у работ, калі знятыя яны з таго, што бачыш кожны дзень?.. І гэта толькі адзін бок медаля, які трымаюць у сваёй руцэ стваральнікі экспазіцыі.**

Істотны і іншы аспект. Безумоўна, прафесійным фатографам (ды і ўсім аматарам гэтага мастацтва) вельмі важна рэгулярна здымаць сваіх родных і блізкіх! Каб не застацца, як той казаў, бы шавец без ботаў. Праз аб'ектыў фатографа пастаянна праходзяць сотні адлюстраванняў жыцця. Аднак, безумоўна, калі ў кадр трапляе сям'я, — менавіта гэтыя фота застануцца як каштоўная сямейная памяць, як тыя моманты, якія ні ў якім разе нельга страціць.

Вельмі кранальную гісторыю пра сваю дачку Варвару расказала **фотамастачка Юлія НАЗАРАВА**: *«Варвара, маленькая чужаземка, якая гаворыць на невядомай мне мове, нечакана ўварвалася ў маё жыццё 11 гадоў таму. Кожны дзень яна імкліва сталее: гуляе і шукае сябе. У яе свеце можна быць касманаўтам або знакамітай фотамадэллю, чырвоналасой русалкай або маленькай феяй, іншаземкай ці проста нябачнай. Яна ходзіць на мяжы сноў і рэальнасці. Яе час зусім не падобны на дарослы. Ён поўны цудаў і пераўвасабленняў. Ён непаўторны і незабыўны»*.



Фота Таццяны СОБАЛЬ.

Тры пакаленні на фотаздымку: злева фатограф Юлія НАЗАРАВА. На рабоце ў цэнтры — яе дачка. Справа — мама.

«Вялікая сям'я» Ганны Бундзелевай зроблена ў форме фамільнага дрэва.



Гэтаксама і на фотаработах Юліі Назаравай Варвара прадстаўлена ў розных вобразах. Тут яна і сапраўды і касманаўт, і русалка, і чужаземка. Велізарныя каляровыя палотны наведвальнікі выстаўкі разглядваюць з ахвотай. Аднойчы маленькая Варвара пасталее, а гэтыя творы мастацтва назаўсёды застануцца яе сямейнай памяццю.

Пра цікавы свет адносін паміж блізкімі людзьмі разважаюць куратары выстаўкі. Яны адзначаюць, што, на першы погляд, сям'я — зразумелая кожнаму з нас сістэма. Але ў той жа час гэта складанае паняцце, якое выклікае велізарную колькасць самых розных пачуццяў і асацыяцый: традыцыя і род, блізкасць і давер, траўма і боль. Сям'ю можна вызначыць па-рознаму, але яна заўсёды змяшчае ў сабе адносіны паміж яе членамі, якія так ці інакш маюць агульныя сувязі, народжаныя еднасцю месца, сяброўствам, адданасцю, любоўю, інтарэсамі, перакананнямі. *«Фатаграфаванне сям'і нагадвае стварэнне апавядання пра яе. Фатаграфія намагаецца адлюстроўваць адносіны ўнутры сямейнай сістэмы, структуру сям'і, традыцыі, яна агучвае цэнтральныя і табуяваныя тэмы*, — кажуць стваральнікі «Роднага склону». — *Аднак фатаграфія заўсёды абвяшчае пра індывідуальнае ўспрыманне свету і вызначэнне ў ім самога сябе»*.

— Гэты праект задумваўся як праца з архівамі і тэмай сям'і. Здымаць сваіх блізкіх родзічаў — агульная тэндэнцыя ў сучаснай фатаграфіі, — гаворыць **куратар выстаўкі Дзіна ДАНІЛОВІЧ**. — Нам хацелася паказаць беларускіх аўтараў, якія таксама працуюць з гэтай тэмай. Нашы праекты звычайна будуюцца па наступным прынцыпе: ёсць як сучасныя працы, так і знакавыя падборкі, якім ужо дзясяткі гадоў, — яны таксама ўваходзяць у экспазіцыю. Сярод апошніх — творы Сяргея Кажамякіна і некаторых маладых аўтараў. Такім чынам мы даём магчымасць пабачыць пэўную гісторыю беларускай фатаграфіі. Тыя, хто працаваў з архівамі, даследавалі як свае, так і чужыя падборкі фотаздымкаў. Былі нават карткі, якія хтосьці палічыў непатрэбнымі, выкінуў на сметніцу. Але нашы аўтары іх знайшлі і далі ім другое жыццё... Нам было вельмі цікава, што ж адбываецца, калі культавы ці канцэптуальны фатограф здымае нейкія зусім бытавыя рэчы, сямейныя святы, — ці застаецца ён пры гэтым на пэўнай дыстанцыі ад таго, што робіць, як выглядаюць яго работы?

Па-асабліваму цікавы праект Віктара Гіліцкага. Фотамастак здымаў свайго дзядулю, а праз невялікі час зразумеў, што гэта была яго апошняя сустрэча са сваім родным, — таго не стала. Што ж можна пабачыць на тых здымках? Сярод рэчаў, якія нязменна акружалі дзядулю, — стары радыёпрыёмнік і вялікая колькасць асобнікаў «Звязды» — відаць, кожную сваю раніцу дзядуля пачынаў з любімай газеты.

Адметны праект і Вольгі Кірылавай. Яна апрацавала відэаплёнкі, якія калісьці ў яе дзяцінстве здымаў тата. Цяпер жанчына з цеплынёй прыгадвае той час і ўспамінае бацьку крыху наіўным і летуценным. Пра тое, што адносіны з роднымі часам могуць быць складанымі і вельмі траўматычнымі, у сваёй падборцы расказала Жанна Гладко.

Незвычайнай гісторыяй стварэння ўласнага твора падзялілася **фатограф Вольга САВІЧ**:

— Невялікі стары чамадан са мноствам разарваных фотаздымкаў быў знойдзены на мінскім сметніку ў 2017 годзе. Першым маім жаданнем было скласці і ўпарадкаваць усё гэта, зразумець гісторыю тых здымкаў. Але ў працэсе складвання я адчула: нягледзячы на тое, што разарваныя кавалкі збіраюцца ў цэлае, атрыманая выява са мной «не размаўляе». Я не магла мець да гэтых здымкаў ніякіх асабістых пачуццяў, таму што мяне з імі нічога не звязвае. Чаму ад іх адмовіліся — мне невядома, яны страцілі сваіх гаспадароў і праз гэта пазбавіліся сваіх гісторый... З часоў традыцыйных сямейных альбомаў зона дэманстрацыі сямейных фотаздымкаў моцна памянялася. Сёння гісторыю сям'і толькі зрэдку можна знайсці ў папяровых альбомах, якія беражліва захоўваюць і паказваюць толькі блізкім людзям. Цяпер такія здымкі часцей за ўсё выкладваюць у сацыяльныя сеткі і іх можа ўбачыць амаль кожны... «Альбом», прадстаўлены на выстаўцы, выкананы ў тэхніцы калажу, сабраны з фрагментаў чужога жыцця, але ўжо з іншымі ўласнымі новымі гісторыямі.

Яшчэ адзін **куратар выстаўкі, а таксама яе ўдзельнік фатограф Уладзімір ПАРФЯНОК**, адзначае, што ўсё-такі з тэмай сям'і беларусы працуюць мала. Каб арганізатары знайшлі больш неабходнага матэрыялу, яны зрабілі б экспазіцыю, якая заняла б не адзін паверх, а ўвесь будынак НЦСМ. «Я спадзяюся, што праект займее працяг, што з'явяцца новыя цікавыя работы пра сям'ю, адносіны з роднымі людзьмі, — мяркуе Уладзімір Парфянок. — Хочацца, каб усе мы здымалі кола сваіх блізкіх людзей, не саромеліся гэтага, выносілі на паверхню — гэта вельмі важна».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Ці чулі?

# Луцкевічы ля Луцэвіча

## У сталічным парку імя Янкі Купалы ўсталявалі памятны валун імя братоў Луцкевічаў

**На камені з мемарыяльнай шыльдай пазначана: «На гэтым месцы стаялі дамы сям'і Луцкевічаў, дзе ў 1896—1906 гг. жылі вядомыя беларускія дзеячы Антон і Іван Луцкевічы».**

Памятная дошка ўсталявана непадалёк ад музея Янкі Купалы, таму каля яе ўжо пачалі спыняцца падчас экскурсій.

Калісьці на месцы парку знаходзілася жылая забудова. Тут была і вуліца Садовая, на якой стаяў і дом Зоф'і — маці братоў Луцкевічаў. Самі Антон і Іван жылі тут з 1896 года па 1906 год — да таго, як пераехалі ў Вільню.

Як адзначае ўнучатая пляменніца братоў Луцкевічаў Маргарыта Пярова, якая цяпер жыве ў Санкт-Пецярбургу, памятную шыльду ўдалося ўсталяваць дзякуючы супольным намаганням нашчадкаў Луцкевічаў, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Міністэрства замежных спраў, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».



Маргарыта Пятрова адзначае, што спробы ініцыяваць усталяванне памятнага знака рабіліся даўно. Цяпер справа скончылася паспяхова ў тым ліку дзякуючы таму, што супрацоўнікі музея Янкі Купалы пацвердзілі слушнасць усталявання такога мемарыяльнага знака ў сталіцы і зручнасць у выкарыстанні яго для экскурсійных маршрутаў.

Архітэктарам і скульптарам праекта стаў вядомы ў сталіцы прафесіянал Юрый Градаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Пантэон Айчыны

# Алена Іванаўна (19.05.1476 — 20.01.1513)

**Жыццё гэтай жанчыны было прынесена ў ахвяру палітычным інтарэсам блізкіх ёй людзей — бацькі і мужа. Кожны праз яе дамагаўся свайго, а ў выніку зламалі яе жыццё. Хоць, канешне, высокае паходжанне ўжо прадвызначала лёс Алены Іванаўны, якім яна не магла распараджацца. І тым больш прыстойна выглядаюць паводзіны Алены Іванаўны, якая захавала сваю чалавечую і жаночую годнасць. Яе лёс, сапраўды, светлая старонка ў змрочнай гісторыі варожасці і войнаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім.**

Алена была дачкой маскоўскага ўладара Івана III і пляменніцы апошняга візантыйскага імператара Канстанціна XII Палеалога, Сафіі. Бацька Сафіі, малодшы брат імператара Фама, знайшоў прытулак пры двары папы рымскага Паўла II. У надзеі пашырыць свае ўплывы папа сасватаў Сафію за вялікага князя маскоўскага Івана III. З гэтага шлюбу і нарадзілася ў 1476 г. Алена. Выхаваная ў строгім шанаванні бацькоў і адданасці праваслаўнай веры, яна была б добрай жонкай якому-небудзь удзельнаму князю, як яе сёстры, і, пэўна, пачувала б сябе шчаслівай у сямейным жыцці. Аднак гістарычныя падзеі рашуча павярнулі яе лёс. Да Алены Іванаўны пасватаўся сам вялікі князь літоўскі Аляксандр Казіміравіч.

Гэта быў палітычны акт з мэтай паразумецца з Іванам III. Не маючы дастатковых сіл супрацьстаяць Маскве, урад ВКЛ (паны-рада) адно з выйсцяў бачыў у саюзе з маскоўскім уладаром праз шлюб яго дачкі з вялікім князем літоўскім. Магчымасць такога шлюбнага альянсу неафіцыйна абмяркоўвалася даўно, і толькі ў 1494 годзе Іван III даў згоду на яго, аднак пры ўмове не прымушаць Алену да прыняцця каталіцтва. І Аляксандр вымушаны быў прыняць гэтую ўмову.

І вось 13 студзеня 1495 г. Алена Іванаўна пакінула Маскву, каб ужо ніколі не вярнуцца ў родны горад. Бацька падрабязна і строга настаўляў дачку, як сябе паводзіць у чужой краіне: галоўнае — не падавацца ціску і ўгаворам каталікоў перайсці ў іх веру. Пакідаючы родны дом, Алена гучна плакала, нібыта прадчувала бяду.

У Літве Алену сустракалі ўрачыста і радасна. Людзі шчыра верылі ў тое, што шлюб Аляксандра і Алены прынясе мір паміж Літвой і Масковіяй. Паводле сведчанняў сучаснікаў, Алена вызначалася не толькі добрым і лагодным характарам, але і чароўнай прыгажосцю, што падкупляла сэрцы кожнага, хто яе бачыў. Вянчанне 34-гадовага Аляксандра з 19-гадовай Аленай адбылося 15 лютага 1495 г. у віленскім касцёле Св. Станіслава. Разам з біскупам урачыстасць цырыманіял выконваў і праваслаўны святар, які прыехаў з Аленай з Масквы. З самага пачатку веравызнанне стала паміж мужам і жонкай.

Тым не менш Алена падтрымлівала мужа ў яго дзеяннях і палітычных рашэннях, суправаджала яго ў паездках па краіне, пазней дапамагала яму стаць польскім каралём і нават паабяцала свекрыві, каралеве Альжбэце, служыць ёй з «поўнай радасцю і пакорлівасцю». Невядома, ці прынёс Алене гэты шлюб простае жаночае шчасце, бо ўсё ж яна не нарадзіла дзяцей. А непрыемнасцяў ёй хапала, бо на яе насядалі каталікі з прапановамі прыняць каталіцтва, пазней палякі адмовяцца прызнаваць яе польскай каралевай і каранаваць. Як мог, Аляксандр абараняў жонку і заявіў каталіцкім святарам, каб яны не ўмешваліся ў ягонае сямейнае жыццё. Сваю любоў да жонкі ён паказваў не толькі абаронай яе веравызнання ці багатымі падарункамі, але і праявамі простага чалавечага клопату. Так, ведаючы яе любоў да музыкі, Аляксандр запрасіў у Вільню з Кракава слыннага капельмайстра Генрыха Фінека.

Не спыніў гэты шлюб войнаў з Масковіяй. Іван III на падставе таго, што Аляксандр не выконвае дамовы (нібыта прымушае Алену да лаціны), развязаў чарговую вайну з ВКЛ. Алену лічылі віноўніцай гэтай вайны. А яна ездзіла ў непрыхільны да яе Кракаў, каб выцягнуць адтуль мужа для абароны краю. Яна, падаючыся просьбам польскіх саноўнікаў, угаварыла Аляксандра памірыцца з Іванам III і ўратаваць польскія землі ад спусташальных набегаў маскоўскіх саюзнікаў — крымскіх татар. Урэшце, у лісце да бацькі горача прасіла спыніць вайну.

«Калі, гасудар бацюшка, Бог табе не паклаў на сэрца мяне, дачку сваю, мілаваць, дык навошта мяне з зямлі сваёй выпусціў і за такога брата свайго выдаваў? Злітуйся, вазьмі па-старому любоў і сяброўства з братам і зяцем сваім».

Колькі болю гучала ў яе словах, якія не кранулі бацькоўскае сэрца. Між тым Алена выконвала бацькоўскі наказ і цвёрда трымалася праваслаўя.

Са сваіх багатых маёнткаў (Княжыцы, Смаляны, Браслаў, Лёчыцы і інш.) і Магілёўскага староства Алена падтрымлівала праваслаўную царкву ў ВКЛ. Вядомыя яе шчодрыя падарункі віленскаму сабору Прачыстай Багародзіцы (які яна аднавіла) і Пакроўскай царкве, менскаму Узнясенскаму манастыру і Сабornай царкве, кіеўскаму манастыру Св. Мікалая, Супрасльскаму манастыру і іншым. З імем Алены Іванаўны звязана і з'яўленне ў Менску цудадзейнага абраза Менскай Божай Маці. Гэты абраз, паводле маскоўскага дакумента 1597 г., «надала славное и святое памяти королевое Олена». Яна ж прывезла ў Літву цудадзейныя абразы Віленскай, Каложскай, Бельскай адзігітрый і перадала мясцовым цэрквам.




Іншым стала жыццё Алены пасля смерці мужа ў 1506 годзе. Аляксандр завяшчаў апеку над ёй свайму брату Жыгімонту Казіміравічу, якому перадаў вялікае княжэнне. Падтрымка Алены прыйшлася дарэчы Жыгімонту, калі рэальна існавала пагроза захопу ўлады князем Міхаілам Глінскім. У падзяку Жыгімонт аддаў Алене Іванаўне Бельск, Сураж і Бранск. Багатая маладая ўдава, бідавочна, сумавала ў чужой краіне, без сям'і, без родных, без сяброў. Яна часта наведвала свой дом у Ніжнім замку ў Вільні і наведвала свае маёнткі, асабліва Браслаў, дзе заснавала жаночы манастыр і царкву Св. Варвары. Падазравалі, што Алена хоча вярнуцца ў Маскву. Якраз яе багацце і стала фатальнай перашкодай для вяртання. Асноўную частку свайго скарбу коштам 400 000 дукатаў (гэта васьмігадовы даход польскіх каралёў) Алена захоўвала ў віленскім кляштары францысканцаў. Баючыся, што гэтае багацце Алена вывезе ў Маскву, ёй не выдавалі яго, а ваявода віленскі Мікалай Радзівіл забараніў ехаць у Бранск, дзе яе чакалі маскоўскія атрады. Хоць Жыгімонт і адмяніў загад ваяводы, але выезд у Бранск сарваўся.

Загадкавай была смерць Алены Іванаўны. Яна ў 1513 годзе патаемна дамовілася са сваім братам, вялікім князем маскоўскім Васілём Іванавічам, вярнуцца ў Маскву. Для гэтага яна збіралася выехаць у Браслаў, куды павінны былі падысці маскоўскія атрады. Ёй ужо непатрэбны быў і скарб, яна проста хацела вярнуцца на радзіму. Аднак на загад Радзівіла Алену сілай адвезлі ў маёнтак, дзе яна раптоўна памерла. Падазрэнне ў яе смерці лягло на Мікалая Радзівіла, па заказе якога нібыта яе атруцілі. Смерць Алены не засмуціла Жыгімонта: «Гэтым дзяржаве нашай нямала паменшыла клопату». Хоць шчыра смуткавалі па сваёй добрай гаспадыні праваслаўныя вернікі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Калі і хацелася б знайсці нейкія заганы ў Алены Іванаўны, дык гэта цяжка зрабіць. Яе светлы вобраз бачыцца як постаць святой, якая адпакутвала і за сваю веру, і за людзей, якім яна спрыяла сваёй добрай і чыстай душой.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Сваімі словамі

# ПРОСТАЯ ЛЮБОЎ. І МІСІЯ



**У гэтым годзе была надзвычай прыгожая зіма. Трэба прызнаць, што такіх не выпадала даўно. Мажліва, снегу не намяло, як у даўнія часы, да самых стрэх, але сумёты былі немаленькія і ляжалі доўга. Аднак ці ўсе адважыліся praкласці свае сцяжынкі сярод гэтага белага харастра?..**

Асабіста я гэтай зімой зведала многія радасці. Па-першае, навучылася катацца на снаўбордзе. Прылада гэтая, між іншым, не такая простая, як можа падавацца на першы погляд. Напачатку патрэбен чалавек-умелец, які растлумачыць, што і чаму трэба рабіць, раскладзе па палічках тэхніку язды. А далей — рэгулярныя трэніроўкі: яны, бадай, немагчымыя без болю і падзенняў, без пад'ёмаў і спускаў. Адчуванне радасці можа з'явіцца толькі дзесьці напрыканцы, калі нарэшце хоць нешта атрымаецца!

Мая вясковая бабуля прыдумала снаўборду вельмі слушную, цалкам беларускую назву — «апалонік». Праўда, гараджанам трэба растлумачыць, што апалонік — гэта драўляная лыжка, часцей за ўсё зробленая ўласнымі рукамі, выдзеўбаная з суцэльнага масіву. Пагадзіцеся, падабенства ёсць: становішся на вялікую драўляную лыжку і скочваешся на ёй са слізкага схілу!..

Гэтай зімой я схадзіла на шыкоўнае лядовае шоу ў цырку, пакаталася на каньках, пабачыла заснежаныя Карпацкія горы (і, вядома ж, трапіла на вяршыні некаторых з іх), апынулася ў эпіцэнтры завірухі. Падаецца, так і павінна быць, гэта ідэальны расклад: заснежаныя зімы, квітнеючыя вёсны, спякотныя леты, залаціста-барвовыя восені! Дзе яшчэ, у якім іншым клімаце паспееш атрымаць такую розную асалоду?

Яшчэ адной прыкметнай падзеяй гэтай зімы была вандроўка па Беларусі — у сядзібу «Налібоцкія васількі», што на Валожыншчыне. Пасля гарадскога тлуму апынуцца на ўскрайку пушчы, пасярод бяскрайніх палёў і амаль у поўнай цішыні, было досыць нязвыкла. Але, вядома ж, прыемна. Цікава, што гэтай зімой з'явіўся чалавек, які зрабіў вандроўкі па Беларусі сваёй працай. Сярод мноства варыянтаў прафесійнага развіцця і думак, куды скіраваць сілы і крэатыў, была выбраная не праца на ўжо распяхоўныя кампаніі, а стварэнне ўласнага айчыннага брэнду. Адкрываць Беларусь для сябе і іншых, нягледзячы ні на якія перашкоды, не зважаючы нават на вялізныя маразы, — гэта варта павагі.

Насамрэч праект Асі Паплаўскай стартаваў яшчэ ў сярэдзіне восені. Маладая блогерка і журналістка стварыла ўласны сайт: http://poplavskaja.by. Першапачаткова сярод сфер зацікаўленасці Асі былі ежа, у тым ліку службы дастаўкі, — кавярні і ўласна кава. Але досыць хутка Паплаўская знайшла новую нішу — travel-журналістыка. Як ні дзіўна, дагэтуль яна ў Беларусі была запоўнена досыць слаба. Вандруй і пішы пра гэта на пастаяннай аснове — і ты акажашся адным з нямногіх!

Такім чынам, нягледзячы на нялітасцівую зіму, дбаючы пра распяхоўвасць свайго стартапу, Ася Паплаўская пачала вандраваць па розных кутках Беларусі. І калі напачатку яна актыўна пісала пра гарады, то цяпер яскрава вымаляваліся дзве новыя асноўныя лініі — гэта аграсядзібы, якімі так славіцца наша краіна, і беларуская касцёлы. Як той казаў, усё геніяльнае проста!

Цяпер у Мінск Ася заязджае хіба што перапачаваць. Ладная частка яе жыцця праходзіць у розных кутках краіны. Калі меркаваць па тым, што піша і фатаграфуе Ася, яна сапраўды вельмі любіць Беларусь і бачыць сваю місію ў тым, каб як мага болей людзей выбраліся з дому і нарэшце ўбачылі прыгажосць Радзімы...



Блогерка зазвычай не хавае сваіх эмоцый і дзеліцца імі ў тым ліку ў сацыяльных сетках, дзе можна прачытаць, напрыклад, такое:

— Гараджан палохае надвор'е, а мы з Цішкам (невялікі сабака. — **Аўт.**) у сядзібе «Мядзведжы кут». Коўзаемся з гары. Гуляем па лесе, прабіраючыся скрозь метры снегу, — Цішку складана скакаць, і я бяру яго на рукі. Атрымліваем асалоду ад чыстага паветра і прыгажосці вакол. А пасля грэемся каля каміна... Добра ў вёсцы, калі ёсць Цішка.

Падаецца, сапраўднае харaство — яно насамрэч у простых словах і простых рэчах. Мы прывыклі шукаць дзівосы за акіянам, чакаць, што цуды прыйдуць аднекуль здалёк. Але рэальнае шчасце часам дзесьці зусім побач ці нават пад нагамі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Фота з асабістага архіва Асі ПАПЛАЎСКАЙ**

■ Узровень-40

# МАРШРУТЫ ПАМЯЦІ

**Тэму гэтых нататак, канешне ж, навеялі апошнія падзеі вакол маршрутчыкаў. А некалі і паняцця такога нават не ведалі. Якія там сучасныя хуткасць і камфорт? Ёсць на чым ехаць, ужо добра... Гэта цяпер у салоне табе і Wi-Fi, і тэлевізар, і падаграванне з ахаладжваннем...**

**У юнацтве (ды і зараз раз-пораз) я любіў пры выпадку гаварыць, што нарадзіўся і жыву ў «партовым горадзе Смілавічы». Калі здзіўлена перапытвалі, што маю на ўвазе, даводзіў: першыя рэгулярныя аўтобусныя зносіны ў краіне былі наладжаны з Мінска ў Лагойск, Плешчаніцы і Смілавічы. Калі не падводзіць памяць, было тое ў 1927 годзе. Ну дык чым не партовы горад? Да сталіцы, Чэрвеня і Смалявіч — практычна аднолькавая адлегласць. Пазней хадзілі чуткі (адкуль яны ўзяліся, не ведаю), што ад Мінска да Смілавіч збіраюцца пусціць тралейбусы. Не спраўдзілася, але вось што аўтобусамі за сваё жыццё давялося паездзіць, дык тое праўда. У адрозненне ад іх для мяне, напрыклад, чыгуначны транспарт доўгі час заставаўся ў пэўным сэнсе экзатычным...**



МАГІЛЁЎСКАЯ шаша некалі была двухпалосная. Абапал яе раслі дрэвы, месцамі вельмі вялікія бярозы, якія схілялі, здавалася, ледзьве не да самага асфальту свае галінкі. З-за гэтага ў маіх успамінах шаша чымсьці нагадвала старажытны тракт. Асноўным аўтобусам у напрамку Мінска быў «ЛАЗ». Каля 30 кіламетраў да сталіцы ён ехаў гадзіну (часам — больш), білет каштаваў 40 капеек.

**«Яшчэ адной дзеючай «асобай» стужкі быў міжгародні «Ікарус», той, што з мяккімі крэсламі і падлакотнікамі. Гэта ж касмічны карабель па тых часах!»**

Натужліва пераадолеўшы пад узгорак каля кіламетра і выехаўшы з пасёлка на «Магілёўку», аўтобус адразу спыняўся на ўзбочыне. Па-першае, тут быў неафіцыйны прыпынак. Кіроўца запускаў пасажыраў выключна праз пярэднія дзверы, абілечваючы кожнага. Па-другое, самае галоўнае, пасля гэтага ён з дарожнымі дакументамі ішоў, як каментавалі ў салоне, «адзначацца» ў нешта накшталт дыспетчарскага пункта — цаглянага будынка, абкладзенага пліткай, праз дарогу. Потым усё паўтаралася яшчэ двойчы. Кіроўца адсутнічаў кожны раз хвілін па 5—7 (мне ў дзяцінстве здавалася, што цэлую вечнасць), адсюль і тая гадзіна ці больш да сталіцы. Далібог, дагэтуль не магу зразумець, навошта было «адзначацца» на адзінай дарозе, асабліва ад'ехаўшы ад пасёлка на кіламетр?

У «ЛАЗах» было спякотна летам і холадна зімой. Хадзілі яны раз у гадзіну-паўтары, таму паўпустымі бывалі рэдка. Больш свабодна станавілася хіба на палове дарогі са сталіцы, калі частка пасажыраў выходзіла ў Прывольным і Лугавой Слабадзе. Асабліва запоўненымі былі з самага ранку і ўвечары, калі ў сталіцу і назад ехалі рабочыя і студэнты. Стаячых людзей у гэты час было, як той казаў, пад завязку. Неяк, ужо калі вучыўся ва ўніверсітэце, атрымаў падручнікі. Заходзіў (больш правільна «ўціснуўся») у аўтобус адным з апошніх, узняўшы да грудзей вялікую спартыўную сумку. Стоячы на прыступках, нават трымаць яе за ручкі не давялося, — настолькі цесна стаялі пасажыры...

Стаўшы студэнтам, пражыў у сталіцы ў стрыечнай сястры вельмі нядоўга, вырашыў ездзіць кожны дзень на вучобу з дому. Тут жа



сябры, знаёмыя, зноў жа мамчыны прысмакі. Наступныя пяць гадоў мой графік і зімой, і летам быў такі. Пад'ём у 5.50, першы аўтобус на Мінск ішоў у 6.13, другі — у 6.38. Я ездзіў на апошнім. За паўгадзіны трэба было сабрацца, паснедаць і паспець на яго, балазе, аўтастанцыя знаходзілася побач. Праўда, здаралася і так, што я ўставаў, збіраўся, еў, а потым... зноў ішоў спаць. Канешне, калі вярнуўся ў гадзіну-другую ночы, а прачнуўся ў 5.50... З прычыны ранняга выхаду з дома часам лавіў на сабе здзіўленыя позіркі аднакурснікаў. Вясной-восенню, ды і летам часам у шэсць гадзін раніцы бывае халаднавата. Таму мой світар ці куртка выклікалі здзіўленне ў тых, хто выйшаў з дому ў кашулі, калі ўжо пацяплела.

САМЫ трывалы ўспамін за тыя пяць гадоў — калі ты сядзіш у амаль цёмным і халодным салоне і пакрысе правальваешся ў сон... Раз — здрыгануўся! І сусед так жа побач. Праз некалькі хвілін — зноў... Атрымаць месца і зімой і летам на коле — горш не прыдумаеш. Сядзець высока нязручна, ногі зацякаюць, вопратку не зняць, а ад колаў ідзе гарачыня і пах паліва. І спацелы, часам, як пасля лазні, ты выскокваеш з салона на 30-градусны мароз, хапаючы ротам свежае паветра... Пасля студэнцкіх гадоў у мяне яшчэ працяглы час была алергія, нават на гэтыя ўспаміны, не тое што на новыя паездкі ў «ЛАЗах».

Цікава, што ў мяне аўтобусы маюць пэўнае дачыненне да прафесіі не толькі як сродак перасоўвання. Мабыць, класе ў сёмым я напісаў сачыненне, як мы ўсёй сям'ёй ездзілі ў Мінск у музей Вялікай Айчыннай вайны. Настаўніца яго ўхваліла, зачытаўшы перад класам, але сказала, што знізіла адну з адзнак за фразу «мы селі на аўтобус». Ужо выкладчыца журфака ацаніла замалёўку першакурсніка пра тое, як узнікае, фарміруецца і пачынае жыць па сваіх унутраных законах чарга (а без іх ніколі не абыходзілася, таму лепш было білет набываць загадзя) пасажыраў на прыгарадны аўтобус. Вельмі раіла аддаць матэрыял у газету — і яго надрукавалі!

РАНЕЙШАЯ аўтастанцыя «Аўтазаводская» знаходзілася прыкладна там, дзе зараз у пачатку Партызанскага праспекта стаіць стэла ў гонар партызанаў. Будынак з касамі-акенцамі ўяўляў сабой цесны драўляны дамок, побач з якім былі яшчэ нейкія пабудовы і павільёны. Сама аўтастанцыя знаходзілася нібы ў «кратары» — значна ніжэй узроўню суседняй вуліцы. Калі аўтобус ад'язджаў ад «платформы», ён рабіў такі круг па тэрыторыі з наборам «вышыні», што на нейкі момант складвалася ўражанне — падымаемся па горным серпанціне. Калі ў іншым месцы пабудавалі цяперашнюю, гэта было, канешне, як неба і зямля.



...Па горадзе да месца вучобы (журфак тады знаходзіўся на Свярдлова) было яшчэ каля гадзіны на тралейбусе і ніяк інакш. Памятаеце тыя «ЗіУ»? Настальгія захавалася дагэтуль. Заўсёды размяшчаўся на прасторнай задняй пляцоўцы, дзе не было сядзенняў. Ну і што, што стоячы? Затое праз вялікія вокны ўсё навокал відаць. Прыгадваю, як асабліва падабалася вяртацца на тралейбусе пасля заняткаў да «Аўтазаводскай», асабліва летам. Сярэдзіна дня, пасажыраў не вельмі шмат, тралейбус па праспекце бяжыць хутчэй, вокны адчынены і ў іх урываецца свежае ад руху і толькі што палітага вадой асфальту паветра... Што можа быць лепш, калі ты едзеш дадому?!

Канешне, верхам камфорту пасля «ЛАЗаў» былі «Ікарусы», асабліва мне падабаліся з «гармонікам». Дарэчы, іх часам давалі на замену ці калі было вельмі шмат пасажыраў і да Смілавіч з новай «Аўтазаводскай». Гэта заўсёды радавала, бо шанцы выехаць з горада хутчэй значна павялічваліся. А яшчэ было неяк нязвыкла бачыць гэты гарадскі аўтобус на вуліцах пасёлка. Ён выглядаў як нейкі аранжавы прышэлец з іншых сусветаў. Дарэчы, пра кур'ёз, звязаны з «Ікарусамі». Неяк на адным убачыў шыльду «Хуткасны». І задумаўся: Шабаны дзе, ведаю, Зялёны Луг таксама, недзе там Серабранка... А дзе Хутка́сны? Вось чамусьці так прачытаў.

А памятаеце даўні фільм «Кіроўца аўтобуса» са знакамітым Віктарам Тарасавым у галоўнай ролі і зусім маладым яшчэ Дзмітрыем Харацьянам? Яшчэ адной дзеючай «асобай» стужкі быў міжгародні «Ікарус», той, што з мяккімі крэсламі і падлакотнікамі. Гэта ж касмічны карабель па тых часах! На такім даводзілася ездзіць на экскурсіі ў Кіеў, Львоў. Зрэдку — з «Усходняга» да павароту на Смілавічы на транзітных міжгародніх. Калі працаваў у раёнцы, зноў жа часцей на транзітных вяртаўся з Чэрвеня дадому (рэйсавыя хадзілі не так часта). Білет абыходзіўся ці то столькі ж, як на прыгарадны аўтобус, ці то на нейкія капейкі даражэй. Хоць потым даводзілася ад шашы ісці ў пасёлак пешшу, паездка на такім «Ікарусе» таго каштавала.

А вось са Смілавіч да Чэрвеня хадзіў рэйсавы «ПАЗ» малой умяшчальнасці. На такім, памятаю, ад фабрыкі, дзе працавалі бацькі, мы ездзілі на экскурсію ў Хатынь і на Курган Славы. Яшчэ адзін успамін з юнацтва... У адрозненне ад Мінска, дзе многія жыхары пасёлка працавалі, у райцэнтр накіроўваліся найперш у бальніцу, ваенкамат, сабес. Толькі бліжэй да Чэрвеня пачыналі з'яўляцца пасажыры, што ехалі на работу, або вяскоўцы, якія выпраўляліся ў крамы па пакупкі.

САМЫМІ лепшымі часамі, на мой погляд, былі тыя, калі паміж Смілавічамі і Мінскам пачалі курсіраваць у якасці маршрутак аўтобусы «Бычкі» («ЗІЛ»). Потым іх чамусьці знялі. І адну «жывёлу» замянілі на іншую — «Газель»... Неяк даволі хутка рухомы састаў фірмы-перавозчыка пачаў «вымушаць жадаць лепшага». У адной маршруткі ў дождж магло ліцца са столі, у другой у спёку не адчыняцца вокны... Але гэта яшчэ што? Брат стаў сведкам таго, як з «Газелі» падчас руху... сарвала дах. Балазе, ніхто не пацярпеў. Сам я, вяртаючыся з жонкай у амаль пустой маршрутцы ў Мінск, ледзь не апынуўся пад коламі машын, што ехалі за намі. Выпадкова звярнуў увагу, што задняя дзверы ледзьве «закрытыя» на нейкі... раменьчык. Каб нехта падчас руху абапёрся б на іх... Мне гаварылі, што той кіроўца, якому я сказаў пра дзверы, звольніўся ці не ў той жа дзень. А саму фірму-перавозчыка закрылі, спадзяюся, дзякуючы маім матэрыялам пра тое, што рабілася...

ШТО яшчэ важна ў падарожжы акрамя ўласна дарогі? Спадарожнікі! Гаджэтаў жа, каб бавіць час, тады не было. Вось і размаўлялі: са знаёмымі і выпадковымі незнаёмцамі. Памятаю, неяк вяртаючыся з Чэрвеня, зачапіўся языкамі, як той казаў, з дзяўчынай побач. Проста прагаварылі ўсю паездку, як старыя знаёмыя. Неяк давялося ехаць у міжгароднім «Ікарусе» з мужчынам. Ён, як высветлілася, быў воінам-інтэрнацыяналістам, выконваў свой доўг у Афрыцы. Расказаў нямала цікавага. Але так бывае не заўсёды. Неяк вярталіся ў пасёлак з вучобы — кожны са сваёй ВНУ — з вядомым цяпер шоўменам Дзмітрыем Шуніным. Селі насупраць адзін аднаго і дамовіліся расказваць па чарзе анекдоты. У «залік» ішлі толькі свежыя, якія візаві не ведаў. Дык вось, гадзіну ехалі, а ніводны не здолеў расказаць іншаму патрэбнае.

**«Атрымаць месца і зімой і летам на коле — горш не прыдумаеш. Сядзець высока нязручна, ногі зацякаюць, вопратку не зняць, а ад колаў ідзе гарачыня і пах паліва».**

...АЎТАСТАНЦЫЮ ў пасёлку даўно закрылі. На вялікай пляцоўцы перад ёй, дзе некалі разварочваліся або стаялі ў чаканні рэйсаў аўтобусы, будуюць — усё ніяк не дабудуюць — гмах-краму. Дыспетчарскія абапал шашы, куды хадзілі «адзначацца» кіроўцы, знеслі. Сама дарога даўно стала чатырохпалоснай, праўда, дрэў уздоўж так і не з'явілася. Цяпер у ролі маршрутак (апроч звычайных рэйсавых аўтобусаў і экспрэсаў) на гэтым напрамку — пераважна «МАЗы» і «Багданы». Курсіруюць ці не кожныя паўгадзіны. За столькі ж даставяць у сталіцу. Шкада, што яны не могуць хоць бы на гэтыя 30 хвілін адвезці ў дзяцінства і юнацтва...

Сяргей РАСОЛЬКА

■

# «ХАЦЕЎ БЫ НАПІСАЦЬ ЯШЧЭ РАМАН ПРА МАЦІ»

**Алег Аляксеевіч ЖДАН заўсёды глыбока імпанаваў мне сваёй рэдкай працаздольнасцю, сваёй сціпласцю — і гэта на фоне несумненнага літаратурнага поспеху. А яшчэ сваім стылем — мову яго твораў маскоўскі крытык Ніна Пісарчык на партале Проза.ру назвала мовай гарманічнай, а пра напісанае ім за многія гады зазначыла: гэтая літаратура працягвае лепшыя традыцыі рускай класікі.**

***— Паважаны Алег Аляксеевіч, у маладыя гады вы пераспрабавалі сябе ў розных прафесіях: былі слесарам, інжынерам-дыспетчарам у Карагандзе і Брацку, рабочым Мінскага трактарнага завода, рэдактарам на тэлестудыі і на «Беларусьфільме»... Ці было гэта ўсё ўсвядомленай, мэтанакіраванай дарогай да пісьменніцтва? І калі сталі прызнаным літаратарам, аўтарам многіх добрых кніжак, ці атрымалі вы (і ці атрымліваеце) задавальненне ад галоўнай прафесіі свайго жыцця?***

— 60-я гады мінулага стагоддзя — асаблівы час у жыцці маладых людзей. Было неяк няправільна сядзець на адным месцы, калі толькі і чуваць пра цаліну, пра вялікія будоўлі... Так, заканчваючы Магілёўскі педінстытут, я ўжо пісаў апавяданні, і калі выпраўляўся ў сваё крыху дзіўнае падарожжа, то спадзяваўся ўбачыць нешта асаблівае. Дзіўнае — таму, што грошай на падарожжа не меў, даводзілася недзе спыняцца, зарабляць і тады ўжо рухацца далей. Так мы з прыяцелем апынуліся ў Цеміртаў у Казахстане, затым праз Алматы ў Ташкенце, адтуль трапілі ў Іркуцк і Брацк. Не магу сказаць, што працаваў і пастаянна шукаў сюжэты. Хоць так і адбылося: убачыў і напісаў гісторыю свайго суседа па інтэрнаце, і апавяданне з'явілася ў «Літаратурнай Расіі» пад назвай «Санька, Туся і брыгадзір».

**«Сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці не знікаюць. Хіба менш зараз любові і дружалюбнасці? Канешне, стала больш падману, карыслівасці, магчыма, жорсткасці... Але, я думаю, з цягам часу грамадства справіцца з усім гэтым».**

А праца на трактарным заводзе, здавалася, наогул не мае дачынення да планаў літаратурнага характару. Зноў жа, трэба было недзе зарабляць на жыццё і недзе жыць, а тут давалі інтэрнат. Аднак менавіта аб гэтым перыядзе я пазней напісаў кнігу «Па абодва бакі прахадной», выдадзеную ў Маскве ў «Маладой гвардыі». Яна выйшла тыражом сто трыццаць тысяч экзэмпляраў і была прададзена ў Маскве і Мінску за некалькі дзён.

Ці атрымліваю я задавальненне ад сваёй літаратурнай прафесіі? Так, асабліва калі прыходзіць новая ідэя, калі нешта атрымліваецца і чую адабрэнне ад калег, ад чытачоў.

***— Нават у новых для літаратара ўмовах? Калі, як сказаў галоўны рэдактар «Раман-газеты» Юрый Казлоў, раней пісьменнік быў уладаром дум, а сёння аказаўся ў ар'ергардзе грамадства...***

— Не, з Юрыем Казловым я не згодны, у ар'ергардзе грамадства сябе не адчуваю. Быць уладаром дум я і не марыў, проста хацеў пісаць аповесці і апавяданні, і каб людзі іх чыталі і атрымлівалі задавальненне. Іншым разам такія падарункі лёсу здараюцца і сёння, у новых, як вы сказалі, умовах.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Бываюць і засмучэнні ад гэтай прафесіі. Напрыклад, адна дама абурылася, што я напісаў апавяданне «Сабачы бог» ад імя жанчыны. Што ж, тэрыторыя жанчын — запаведная тэрыторыя, мужчынам трэба быць асцярожнымі... Але ж іншыя жанчыны паставіліся да гэтага апавядання вельмі станоўча. Яшчэ адна чытачка, з Санкт-Пецярбурга, беларуска, паведаміла ў дачыненні да майго гістарычнага рамана «Князь Мсціслаўскі», што Уладзімір Караткевіч пісаў лепш. Паставіла мяне ў абсалютны тупік: ці можна так параўноўваць? Гэта як сённяшняга паэта параўноўваць з Пушкіным.

***— Не магу не запытацца. Ад сваёй эліты людзі сёння чакаюць нейкай маральнай, нават духоўнай праграмы, з якой вырастае ўсё астатняе. Але пра які духоўны фундамент можна гаварыць, калі амаль да ўсяго, да чаго прыкладвае руку інтэлігенцыя, у сучаснікаў столькі прэтэнзій — да кінамастацтва, якое амаль перастала быць мастацтвам, да інтэрнэту, што ператвараецца ў інфармацыйную сметніцу, нават да літаратурных тэкстаў, прыпраўленых мацяршчынкай?.. Што адбываецца — замена каштоўнасцяў?***

— Многае элементарна проста. Тэлебачанню трэба запоўніць час, а якаснага прадукту мала, вось і ставяць што ёсць — любоўныя серыялы, прымітыўныя дэтэктывы. Не думаю, што ад гэтага здараецца разбурэнне душ. Выключыў тэлевізар — і ўсё пайшло разам з карцінкай. Змяненне каштоўнасцяў калі і адбываецца, то вельмі павольна. Душы людзей абаронены маральнымі прынцыпамі сваіх сем'яў, родных і блізкіх людзей. А галоўнае — мінулых пакаленняў. Тое ж самае і з мацяршчынкай: пройдзе некалькі гадоў, і яна будзе выклікаць толькі неўразуменне. Так што дарэмна стараюцца яе прыхільнікі, шмат чытацкіх сімпатый на ёй не заробіш.

***— У самым пачатку сваёй творчасці вы распрацоўвалі дзве тэмы — жыццё рабочага, гараджаніна і быт людзей правінцыйнага горада. Ніхто не будзе змяншаць важнасць гэтых тэм, асабліва пасля знаёмства з вашымі апавяданнямі беларуска-рускага парубежжа. З часоў Шукшына я не адчуваў такога задавальнення ад пазнавальных характараў «маленькіх людзей», ад сакавітай мовы. Але хачу спытацца вось аб чым. Вы раптам павярнуліся да гістарычнай тэмы, напісалі раманы і аповесць аб далёкім мінулым сваёй роднай прырубежнай***

## Прадстаўляем суразмоўцу

Ждан (Пушкін) Алег Аляксеевіч нарадзіўся ў 1938 годзе ў Смаленску ў сям'і настаўнікаў. Закончыў Магілёўскі педінстытут, пазней — Літінстытут і Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве.

Аўтар некалькіх кніг мастацкай прозы, п'ес, мастацкіх фільмаў, знятых на «Масфільме» і «Беларусьфільме». Актыўна друкуецца ў расійскіх «тоўстых» часопісах. Член Саюза пісьменнікаў СССР і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Піша на рускай і беларускай мовах. Жыве ў Мінску. Працуе ў Выдавецкім доме «Звязда» загадчыкам аддзела прозы часопіса «Нёман».

***Мсціслаўшчыны. Чым растлумачыць такі паварот? Быў сацыяльны заказ ці нейкі душэўны парыў, бо там — Радзіма?***

— Менавіта — Радзіма. Больш за паўвека жыву ў Мінску, але мінчанінам лічу сябе толькі па прапісцы, душа мая па-ранейшаму — там. На вуліцах старога горада, каля ракі Віхры, каля Святога возера з яго легендай, у лясах Лютні... І гэтак не толькі я. У Мінску існуе мсціслаўскае зямляцтва, мы сустракаемся адзін раз на год — тэмпература цела павышаецца пры сустрэчах! Нас многа і мы нічога не забылі.

**«Быць уладаром дум я і не марыў, проста хацеў пісаць аповесці і апавяданні, і каб людзі іх чыталі і атрымлівалі задавальненне».**

Калі захапляешся літаратурнай творчасцю і жывеш у такім дзіўным горадзе, як Мсціслаў, бачыш навокал сляды і прыкметы мінулага, немагчыма не падумаць пра тое, каб неяк іх адлюстраваць, увасобіць. Кінафільмы мы глядзелі ў езуіцкім касцёле (пазней — Мікалаеўскім саборным храме), легендамі падсілкоўваліся на Замкавай гары і каля касцёла кармелітаў, на рэчку бегалі па тэрыторыі разбуранага Тупічэўскага манастыра, грыбы збіралі ў Дуброве, што на палове шляху да Пустынскага манастыра, у школу хадзілі міма царквы Аляксандра Неўскага... А магутныя сярэдневяковыя муры езуіцкага манастыра?! Як тут не прыйдуць у галаву гістарычныя сюжэты? Дзіўна, што такім багаццем не зацікавілася кінастудыя «Беларусьфільм». Але, дзякаваць богу, зацікавіўся Выдавецкі дом «Звязда».

***— У здзіўляючым па сабраных фактах і іх мастацкім вырашэнні гістарычным рамане «Князь Мсціслаўскі» вы ставіце свайго героя — князя Міхаіла Жаслаўскага — перад дылемай: адкрыць вароты войскам рускага цара, якія асадзілі горад, і тым самым выратаваць гараджан ад разні ці трымаць асаду, не будучы ўпэўненым у дапамозе ад Вялікага Княства Літоўскага. А пасля прыняцця цяжкага рашэння, калі ён упусціў у горад аблогу, паўстала іншая дылема: якому гасудару прысягаць? Нашым сучаснікам часта даводзіцца вырашаць такія трагічныя задачы? Калі часта, то атрымліваецца, што кніга да гэтага часу падручнік жыцця?***

— Мяне моцна бянтэжыць думка, што мастацкая літаратура можа быць падручнікам. Галоўны наш настаўнік — само жыццё, больш ніхто не можа чалавека навучыць. Зусім іншыя задачы ў белетрыстыкі: выхоўваць мастацкі густ, пашыраць лексіку чытача, выклікаць у душах добрыя пачуцці, прымушаць задумвацца над праблемамі быцця. І не апошняя задача — дастаўляць задавальненне ад чытання. Не я паставіў князя Жаслаўскага перад жорсткай дылемай, а жыццё. І рашэнне ён прыняў правільнае. Пазней, у 1654 годзе, жыхары вырашылі біцца з войскамі князя Трубяцкога — завяршылася ўсё масавай гібеллю мсціслаўцаў. «Пабіта больш за дзесяць тысяч чалавек», — гэта прызнанне самога цара Аляксея Міхайлавіча. Лічы, амаль усё насельніцтва горада.

Што датычыцца праблемы выбару ў сённяшніх рэаліях — што ж, досвед мінулых часоў можа мець значэнне. У тым ліку і апасродкавана, дзякуючы мастацкай літаратуры.

***— Вы яшчэ і дзіцячы пісьменнік. Скажыце, мы, дарослыя, за сваёй мітуснёй не губляем цяперашняе пакаленне NEXT? Як нам іх чуць — катэгарычных і рамантычных, па-дзіцячаму пяшчотных і па-даросламу патрабавальных, каб не перарывалася сувязь пакаленняў, каб разумелі нас, чулі?***

— На ваша пытанне адказаў адзін з герояў маёй трэцяй кніжкі пра дзяцей і для дзяцей: «Вы яшчэ будзеце ганарыцца намі». Гэта адначасова і назва кнігі, якая толькі з'явілася ў продажы. Канешне, яны будуць лепшымі за нас. Напрыклад, мае сыны лепшыя за мяне — больш дабрэйшыя, разумнейшыя, вытрыманыя. Упэўнены, што дзеці разумеюць нас лепш, чым мы іх. Яны першапачаткова скіраваны на дабро, і бацькоўская (у тым ліку пісьменніцкая) задача такая ж, як у доктара: «не нашкодзь».

***— Некалькі кароткіх пытанняў. Ці лічыце вы магчымым вяртанне да страчаных маральных каштоўнасцяў?***

— Сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці не знікаюць. Хіба менш зараз любові і дружалюбнасці? Канешне, стала больш падману, карыслівасці, магчыма, жорсткасці... Але, я думаю, з цягам часу грамадства справіцца з усім гэтым.

***— Ваш любімы пісьменнік...***

— Любімых пісьменнікаў няма, ёсць любімыя творы. Іх шмат, не пералічыць.

***— Раскажыце пра сям'ю. Вашым блізкім з вамі лёгка, не «прыгнятаеце» сваім аўтарытэтам?***

— Якія аўтарытэты ў сям'і? Сям'я — тэрыторыя, дзе ўсе роўныя — і муж, і жонка, і дзеці, і бацькі. Наконт літаратуры ніхто са мной не спрачаецца, а па ўсіх іншых пытаннях — калі ласка, я не супраць. Мой старэйшы сын Дзмітрый жыве ў Англіі, выкладае матэматыку ў Эрксім універсітэце. Малодшы Андрэй — у Мінску, ён класны праграміст. Не я іх, яны мяне «прыцiскаюць» эрудыцыяй, кемлівасцю. У нас з жонкай Нінай Леанідаўнай тры ўнучкі — Лена, Ксенія, Ніколь, — адна за другую прыгажэйшая.

***— Ці шмат падарожнічаеце па свеце і ці часта бываеце на малой радзіме, Мсціслаўшчыне?***

— Не, я не падарожнік. Для падарожжаў патрэбны час і грошы, так што выбачайце. У Мсціслаўлі — так, бываю даволі часта, асабліва ў грыбную пару. Там у мяне бацькоўская хата.

***— «Планку» вы ўзялі высокую — і творчую, і жыццёвую, — а на перспектыву, напэўна, шмат задум?***

— Я хацеў бы напісаць яшчэ аповесць ці раман аб маёй маці, Веры Іванаўне Пушкінай. Задача гэтая настолькі складаная, што пакуль замірае пяро. Правільней, замірае душа ад складанасці гэтай задачы.

***Звяздоўцы шчыра віншуюць вас, шаноўны Алег Аляксеевіч, з цудоўнай датай — 80-годдзем — і жадаюць здароўя і такога ж творчага даўгалецця і надалей.***

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ**



# ВЯСНА КАРАЛЕЎСТВА

## Чаму пераўтвараецца Саудаўская Аравія?

**На Блізкім Усходзе чарговая дзяржава аб'явіла аб гендарных паслабленнях у законе. З пачатку сакавіка жанчынам у Амане дазволена кіраваць таксі. Дагэтуль шафёрамі таксі ў гэтай краіне маглі быць толькі мужчыны. Праўда, сегрэгацыя за рулём застанецца. Машыны будуць адрозніваца па колеры: з кіроўцамі-мужчынамі — аранжавага і белага колеру, з кіроўцамі-жанчынамі — ружовага і блакітнага. Між тым хваля законаў, якія паступова ўраўноўваюць жанчын у правах з мужчынамі, у апошнія гады пранеслася па ўсіх краінах Персідскага заліва, адзначае aif.ru. Асабліва гэта заўважна на прыкладзе Саудаўскай Аравіі, дзе да нядаўняга часу законы абмяжоўвалі правы жанчын асабліва жорстка. Чаму ў самым кансерватыўным рэгіёне свету пачаліся радыкальныя змены?**

### Прарыў праз стагоддзі

26 верасня мінулага года кароль Саудаўскай Аравіі Салман абвясціў, што з ліпеня 2018 года жанчыны змогуць атрымліваць правы на аўто і кіраваць машынай. Дагэтуль каралеўства заставалася адзінай краінай у свеце, дзе гэта было забаронена. А ў пачатку 2018 года саудаўскім дамам упершыню дазволілі наведваць футбольныя матчы: яны маглі паглядзець гульню з сямейных трыбун у суправаджэнні сваякоў. Таксама жанчын мяркуюць запрашаць для працы ў рэстараны: у тэставым рэжыме да найму супрацоўніц прыступілі ў 16 установах. Хоць яшчэ ў 2011 годзе жанчыны ў Саудаўскай Аравіі не маглі не толькі хадзіць на футбол, але нават быць прадаўшчыцамі ў крамах, юрыстамі, кіраваць кампаніямі і працаваць дыпламатамі.

Справа ў тым, што Саудаўская Аравія — адна з самых кансерватыўных краін свету, дзе прытрымліваюцца вахабізму: руху ў ісламе, які патрабуе ад паслядоўнікаў жыць так, як жылі першыя мусульмане. Таму ў жанчын доўгі час было так мала правоў, нібыта яны дагэтуль жылі ў VII стагоддзі. Да нядаўняга часу ў іх не было нават дакументаў: даныя проста ўпісвалі ў пашпарт апекуна, у ролі якога звычайна выступаў хто-небудзь з блізкіх мужчын (бацька, брат, муж, у некаторых выпадках нават сын).

Пасведчанне аб шлюбе за жанчыну падпісвае яе бацька. У судах паказанні дам лічацца менш каштоўнымі, чым мужчынскія. Працаваць разам з мужчынамі жанчына не мае права, як і знаходзіцца з імі ў адной грамадскай прасторы (за выключэннем бальніц або банкаў). Нават выйсці на вуліцу без суправаджэння сяброўак або сваякоў-мужчын яна не можа.

Перамены наступілі ў апошнія гады ўладарання караля Абдалы. У пачатку 2012-га выйшаў закон, згодна з якім жанчыны атрымалі права працаваць прадаўшчыцамі ў крамах дамскай ніжняй бялізны. Пасля гэтага ім сталі дазваляць прадаваць касметыку, сумачкі, абутак, адзенне і іншыя тавары для прадстаўніц слабага полу. У 2013 годзе кароль упершыню ўключыў жанчын у свой Кансультатыўны савет. Адразу трыццаць дам, асабіста абраных манархам, пачалі прысутнічаць на пасяджэннях савета нароўні са 120 мужчынамі.

### Другая пасля Карана

У 2005 годзе фурор у грамадстве нарабіла кніга пісьменніцы Раджы аль-Санаа «Дзяўчаты з Эр-Рыяда», якая стала самай прадаванай кнігай Саудаўскай Аравіі пасля Карана. Скандальны раман расказваў пра маладых саудавак, якія не выконвалі шматвяковыя традыцыі краіны, пілі шампанскае і ездзілі на аўтамабілях. Кнігу забаранілі, але яе сталі ўвозіць у краіну кантрабандай і прадаваць па 500 долараў за асобнік. Праз год цэнзары вымушаныя былі адмяніць забарону, паколькі не маглі прадухіліць распаўсюджванне рамана. Выпадак добра паказвае настроі часткі жанчын у каралеўстве, асабліва тых, хто атрымлівае вышэйшую адукацыю. Многія з іх не хочуць здавольвацца роляй жонкі, працаваць выкладчыкам у школе або прадаўшчыцай у краме. І такіх з кожным годам становіцца ўсё больш. Толькі ў 2015 годзе, паводле афіцыйных даных, за мяжой вучыліся 150 тысяч саудаўцаў. Трэць з іх былі жанчынамі, якія ў большасці сваёй вярнуліся на радзіму пасля заканчэння навучання. Аднак прымацьіх на высокакваліфікаваную працу гатовыя далёка не ўсе работадаўцы. Для саудаўскага бізнесу яны могуць абысціся ў круглую суму. Бо калі браць дам на працу, то для іх прыйдзецца ўладкоўваць асобныя офісы, зоны адпачынку, нават асобны ўваход, як таго патрабуе заканадаўства.

Супраць жанчын па-ранейшаму працуе і грамадская думка. Паводле даследавання арабскага Цэнтра імя Хадзіджы бін Хувайлід, больш за палову апытаных грамадзян Саудаўскай Аравіі дагэтуль мяркуюць, што жанчынам не месца на касах супермаркетаў, заводах або ў паліцыі, адзначае aif.ru. Супраць рэформаў выступаюць многія вядомыя рэлігійныя дзеячы. Напрыклад, самы высокапастаўлены навуковец-праваднаўца муфтый Абдул-Азіз Аль аш-Шэйх заяўляў, што продаж жанчынамі ніжняй бялізны — гэта «злачынства».

### Без хіджаба

Тым не менш у апошнія гады ў Саудаўскай Аравіі з'яўляецца ўсё больш людзей, якія лічаць, што жанчынам трэба даваць больш правоў. «У першую чаргу гэта новы наследны прынц Мухамед ібн Салман, з чыёй падачы жанчын і сталі пускаць на футбольныя матчы, а таксама дазволілі ім кіраваць аўтамабілямі, — адзначыў aif.ru доктар гістарычных навук, прафесар кафедры сучаснага Усходу Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта Рыгор Косач. — Прынц абапіраецца на маладую саудаўскую эліту, многія прадстаўнікі якой таксама праходзілі навучанне ў еўрапейскіх або амерыканскіх універсітэтах і незадаволеныя празмерным уплывам духавенства на палітычнае жыццё краіны».

Але больш за ўсё на паўзучую фемінізацыю аказваюць уплыў жанчыны, якія працуюць. «Чым больш такіх жанчын, тым менш выконваюцца строгія загады і няпісаныя законы. Жанчыны ездзяць на працу на таксі, што раней вельмі строга забаранялася, не носяць у офісах хіджаб, таму што гэта нязручна, кантактуюць з чужымі мужчынамі. Межы дазволенага размываюцца, і ўлады відавочна гатовыя закрываць на гэта вочы», — адзначыў эксперт.

Пасля дазволу кіраваць машынай у Саудаўскай Аравіі пачалася новая стадыя вайны за жаночыя правы. Цяпер у каралеўстве ідуць спрэчкі аб тым, ці варта адмяніць сістэму апякунства. За адмену гэтай нормы выступалі шматлікія заходнія праваабарончыя арганізацыі, а ў 2016 годзе некаторыя жыхаркі каралеўства нават падалі петыцыю каралю. Пакуль жа ў грамадстве мужчыны відавочна не гатовыя да такіх радыкальных змен. За захаванне апякунства выступаюць нават кансерватыўна настроеныя жанчыны, якія ў адказ на петыцыю ліберальных актывістак нават адправілі каралю ўласнае прашэнне з просьбай пакінуць сістэму ў непарушнасці.

Змяняецца пазіцыя і рэлігійных дзеячаў. Напрыклад, ісламскі багаслоў шэйх Абдала аль-Мутлак на тэлеканале Al Jazeera заявіў, што саудаўскія жанчыны не абавязаны насіць на публіцы абаі — традыцыйныя арабскія чорныя свабодныя сукенкі да пят з доўгімі рукавамі. «Больш за 90 працэнтаў набожных мусульманак у ісламскім свеце не носяць абаі, і нам не варта прымушаць жанчын насіць іх», — сказаў прадстаўнік Савета ісламскага духавенства, вышэйшага рэлігійнага органа каралеўства. Між тым нашэнне абаі жанчынамі Саудаўскай Аравіі прапісана законам краіны, і нават іншаземкі, якія наведваюць каралеўства, абавязаны апранаць гэты прадмет адзення. Невядома, ці пойдзе ўрад на змену заканадаўства, але, як адзначаюць назіральнікі, упершыню саудаўскія ісламскія багасловы дапусцілі саму ідэю адмены гэтага абавязковага атрыбута жаночага гардэроба ў публічных месцах. У большасці арабскіх краін жанчыны, як правіла, носяць адзенне любых колераў і фасонаў, якое закрывае шыю, грудзі, рукі і ногі, пакрываючы галаву хіджабам, радзей хаваючы твар пад нікаб, які пакідае адкрытымі толькі вочы.

«Тое, што цяпер робіць Саудаўская Аравія, — каласальныя змены ў духу Атацюрка. Як вядома, у 20-х гадах мінулага стагоддзя, пасля стварэння Турэцкай рэспублікі, Мустафа Кемаль таксама распачаў рэформы па эмансіпацыі жанчын, якім дазвалялася перайсці на еўрапейскі стыль адзення, быў адкрыты доступ да навучання ў ВНУ, да



шэрагу дзяржаўных пасад. Гэтыя крокі Саудаўскай Аравіі — безумоўна рух у бок Захаду», — заявіў усходазнавец Станіслаў Тарасаў. Наваўвядзенні актыўна падтрымліваюцца прыхільнікамі перамен, у тым ліку арганізацыяй за правы жанчын «Балядзі». Як лічаць эксперты, рэформы ў каралеўстве, што пачаліся, па сутнасці, пасля падзей арабскай вясны, былі вымушанымі — у Эр-Рыядзе вырашылі знізіць магчымую сацыяльную напружанасць, не чакаючы масавых хваляванняў.

### $64 мільярды на забавы

Саудаўская Аравія плануе інвеставаць $64 мільярды на працягу наступных дзесяці гадоў у індустрыю забаў, паведаміла Arab News. Грошы будуць выдаткаваныя на будаўніцтва забаўляльнай інфраструктуры, а таксама на арганізацыю канцэртаў, мюзіклаў, выступленняў комікаў і на будаўніцтва першага ў краіне опернага тэатра ў Джыдзе, заявіў кіраўнік Упраўлення забаў Саудаўскай Аравіі Ахмад бін Акіль Аль-Хаціб. Дарэчы, гэтае ведамства створана ў рамках праграмы сацыяльных і эканамічных рэформаў Vision 2030, агучанай два гады таму наследным прынцам Махамедам бін Салманам.

Такім чынам разлічваецца дыверсіфікаваць эканоміку і зменшыць залежнасць Саудаўскай Аравіі ад нафты, у тым ліку за кошт укладанняў у індустрыю забаў, а таксама за кошт таго, што жыхары краіны пачнуць выдаткоўваць свае грошы на адпаведныя мэты.

Па словах Аль-Хаціба, сёлета запланавана правесці больш за 5 тысяч забаўляльных мерапрыемстваў — больш, чым калі-небудзь у гісторыі каралеўства. Сярод іх — канцэрт гурта Maroon 5 і артыстаў Cirque Du Soleil, удакладняе BBC News. Акрамя таго, сёлета жыхары і турысты ў 56 гарадах па ўсёй краіне змогуць наведаць мюзіклы, шоу для ўсёй сям'і, выступленні стэндап-комікаў, канцэрты, цыркавыя прадстаўленні, фэсты (сярод якіх фестываль джаза).

У сакавіку ў Саудаўскай Аравіі адкрыюць кінатэатр — першы пасля больш чым 35-гадовай забароны. Акрамя таго, у партовым горадзе Джыда, які таксама служыць месцам збору паломнікаў, якія накіроўваюцца ў Меку і Медыну, будзе пабудаваны першы ў краіне оперны тэатр. Усё гэта разам — вялікі крок для краіны, дзе апошнія два дзесяцігоддзі былі забароненыя канцэрты, а таксама музыка ў рэстаранах і крамах.

Аль-Хаціб таксама паведаміў, што краіна мае патрэбу ў інвестыцыях у памеры $267 млрд на будаўніцтва забаўляльнай інфраструктуры. Паводле яго слоў, з дапамогай маштабнай праграмы па развіцці індустрыі забаў у краіне да 2030 года будзе створана 224 тысячы новых працоўных месцаў.

Пры гэтым варта мець на ўвазе, што абавязкам караля Саудаўскай Аравіі, які мае тытул захавальніка дзвюх святынь, з'яўляецца іх зберажэнне і доступ мусульман усяго свету ў Меку і Медыну, і гэтай жа акалічнасцю, а не столькі роляй на нафтавым рынку, вызначаецца «вага» гэтай дзяржавы. У ролі краіны — радзімы Мухамеда і ісламу Саудаўская Аравія не можа не ўдзяляць увагу ў глабальнай палітыцы як натуральны сусветны цэнтр сілы, заўважае kommersant.ru. Праграма пераўтварэнняў, якая рэалізуецца ў краіне, — адна з самых складаных ідэй, якія калі-небудзь увасабляліся на нацыянальным узроўні. Саудаўская Аравія мае намер адначасова стаць «лічбавым грамадствам» з адпаведнай схемай эканомікі і ў гэтых умовах не толькі захаваць сваё незвычайнае для сучаснага грамадства зліццё рэлігійных нормаў з правам і культурай, але і актыўна прапаноўваць гэты сплаў у якасці ўзору для мусульман усяго свету.



**Захар БУРАК.**

Дзіна СТРАЛКОВА:

# «Я ПАКАЗВАЮ СВАЁ ЦЕЛА, АЛЕ ГЭТА НЕ ЗНАЧЫЦЬ, ШТО Я Ў ЗАХАПЛЕННІ АД ЯГО»

## Гісторыя абсалютнай чэмпіёнкі краіны па фітнес-бікіні

**Дзіна Стралкова прыйшла ў трэнажорную залу толькі ў 31 год. Характэрна, што гэта здарылася ў Міжнародны жаночы дзень. Тады яна і не здагадвалася, што гэты звычайны паход перарасце ў справу яе жыцця, бо адукацыя юрыста мае на ўвазе працу ў офісе, а не на трэнажорах. Новае хобі, без перабольшання, змяніла жыццё Дзіны: яна пазбавілася ад праблем з алкаголем і адмовілася ад многіх прадуктаў харчавання, стварыла сабе новае цела і знайшла цікавую работу. Сёння спартсменка — абсалютная чэмпіёнка краіны ў катэгорыі майстры (гэта катэгорыя для жанчын старэйшых за 35), бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2017 года, яна знаходзіцца ў чацвёрцы найлепшых турніру «Арнольд» у Еўропе і ЗША. Пра тое, як выходзіць на сцэну ў купальніку, класціся пад нож пластычнага хірурга дзеля конкурсу і наведваць трэнажорную залу пяць разоў на тыдзень, Дзіна Стралкова расказала ў сваім інтэрв'ю «Звяздзе».**

***— Што ўяўляла ваша жыццё да таго, як сталі захапляцца фітнес-бікіні?***

— Для мяне гэта не першая спроба ў спорце. У дзяцінстве я займалася фігурным катаннем. Была адзіночніцай, таму што высокая для парнага катання. У 16 гадоў скончыла з вялікім спортам, апошні год мяне праследавалі траўмы, перастала паказваць вынікі. Да таго ж на двары быў 1995 год, трэнеры з'язджалі, трэба было думаць, што рабіць далей, засяроджвацца на вучобе. У мяне вельмі амбіцыйныя бацькі, асабліва маці, таму планы з Інстытутам фізкультуры або тэатральным адкідаліся адразу, трэба было выбіраць нешта прэстыжнае. Паступіла на юрфак БДУ. Практычна адразу зразумела — гэта не маё, часцяком наогул не мела паняцця, пра што чытаю ў канспектах і падручніках. Пасля атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці працавала зусім мала, потым спрабавала ў розных гандлёвых кампаніях, але і там не знайшла сябе, мне трэба былі зносіны з людзьмі, рух.

***— Такая нездаволенасць працай часта прыводзіць да дэпрэсій.***

— А ў маім жыцці з'явіўся алкаголь. Я не хаваю, таму што гэта адзін з жыццёвых этапаў. Сітуацыя, калі я адчувала сябе шчаслівай толькі выпіваючы, мяне насцярожвала, я сама выдатна разумела, што гэта заходзіць занадта далёка. Мне пашанцавала, што, калі пачала займацца спортам, усё прайшло неяк само па сабе. Хоць выпіць магу і цяпер, таму што люблю кампаніі.

***— Што матывавала пайсці ў трэнажорную залу?***

— Абсалютна нічога. Туды мяне паклікаў добры сябар, гэта было акурат 8 сакавіка, ён сказаў: цяпер альбо ніколі. На той момант мне было ўжо практычна 32 гады. Схадзіла, вельмі спадабалася, спачатку займалася ў зале, нічога не разумеючы. Скажу, што заўсёды была худзенькай, 8 сакавіка сем гадоў таму я важыла 50 кг, сёння — 62 кг.

Неяк даведалася, што праходзіць конкурс фітнес-бікіні, глядзела тады ў асноўным на амерыканскіх спартсменаў, яны мне падабаліся, але здаваліся такімі велізарнымі. Праз год ужо сама пачала «сушыцца» і да мяне прыйшла думка, што хачу гэтым займацца. Стала шукаць трэнера, які мог бы растлумачыць, як рыхтавацца на прафесійным узроўні. На пошукі такога чалавека спатрэбілася пяць гадоў. Затое зараз працую ў выдатнай камандзе «Стацэнка Цім», усе мае перамогі — заслуга Іветы.

***— Поспехі прыйшлі не адразу?***

— На першых турнірах усё ішло вельмі цяжка, ніхто не верыў, што нешта можа атрымацца. Добрыя словы, падтрымку тады людзі маглі сказаць мне ў твар ці напісаць у каментарыях на старонках у сацсетках, а вось колькі негатыву прыходзіла ў асабістыя паведамленні... Гэта было вельмі непрыемна. У мяне ёсць комплексы, і, як правіла, людзі траплялі менавіта ў іх.

***— У людзей, якія паказваюць сваё цела са сцэны, ёсць комплексы?***

— Вядома, я сабе вельмі не падабаюся. Так, я паказваю сваё цела, але гэта не значыць, што я ў захапленні ад яго. Адзіны раз, калі была задаволеная сабой на 100 % — еўрапейскі «Арнольд», які праходзіў у Барселоне.




***— Як успрынялі такую кардынальную змену прафесіі вашы родныя?***

— Спачатку яны не вельмі разумелі, чым я займаюся і навошта. Гэта не вельмі вітаў і муж, бо змяняецца тваё цела. Калі браў худзенькую, далікатную дзяўчыну, а потым яна стала іншай, мужчыну гэта не вельмі па душы.

***— Дзеля спорту вы павялічылі сабе грудзі...***

— Так, і таксама гэтага не хаваю, бо там нічога асаблівага не было, а потым з'явілася. Мне трэба было сфарміраваць больш правільныя прапорцыі ў целе. «Родныя» грудзі ў мяне былі 4-га памеру, але пасля таго, як пачала ўзмоцнена займацца спортам, вялікі працэнт тлушчу сышоў і грудзі разам з ім. Перад аперацыяй быў міні-кансіліум, дзе ўрачы задалі мне пытанне: «Як вы ацэньваеце свае натуральныя грудзі па пяцібальнай шкале?» Я сказала: на пяцёрку. Чым выклікала іх ступар, маўляў, чаго вы тады прыйшлі? Але ж на спаборніцтвах мяне ацэньвае дзевяць суддзяў, а раз я ўвесь час прайграю, мае грудзі ім не вельмі падабаюцца. У прынцыпе, цяпер ва ўсіх фітнес-бікіні яны зробленыя, ды і ў шматлікіх звычайных дзяўчат, гэта ж модна і нічога тут не зробіш.

***— Як адрэагаваў муж на гэта змяненне?***

— Вельмі станоўча. Мы разам ездзілі на кансультацыю ў клініку.

***— Выходзіць на сцэну ў купальніку не страшна?***

— Не, я ж займалася фігурным катаннем, што там той сукенкі, таму ў мяне быў вопыт з'яўлення на публіцы ў мінімуме адзення. І першы раз не баялася, хутчэй, было нейкае хваляванне, таму што ў зале могуць знаходзіцца розныя людзі, у тым ліку не зусім адэкватныя.

***— Ці адбіліся заняткі спортам на вашым здароўі?***

— Перад Новым годам праходзіла медыцынскі агляд для жанчын 35—40 гадоў, здавала ўсе патрэбныя аналізы, усё было добра. Мабыць, не адбілася, калі толькі ў лепшы бок. Я люблю прабегчы вакол возера кружочак кіламетраў шэсць, стараюся спаць 7-8 гадзін, есці правільную ежу, мне, дарэчы, другую і не хочацца, — гэта залог здароўя, на мой погляд.

***— З моманту, як пачалі займацца фітнесам, сур'ёзна перагледзелі свой прадуктовы кошык?***

— Я хачу есці заўсёды, мне здаецца, калі чалавек не хоча есці, — у яго нешта са здароўем. Пытанне ў тым, што ты ясі і калі.

Маё харчаванне — гэта сем гадоў эксперыментаў. Пасля першага чэмпіянату Беларусі ў 2013 годзе я за 10 дзён папраўлялася на 10 кг, проста ела і не магла спыніцца. Гэта, вядома, ад няведання, мяне правільна не вывелі з падрыхтоўчага да турніру працэсу. Дзякуй богу, усё абышлося без наступстваў для фігуры і здароўя.

Калі я знайшла прафесіянала — трэнера Івету Стацэнку, яна напісала мне спіс прадуктаў, якія можна есці, і я яго строга прытрымлівалася. Прыйшлося адмовіцца практычна ад усіх прадуктаў, якія я ела да гэтага. Калі мы з мужам любілі каўбаску, вяндліну, то гэта, вядома, сышло. Таксама ў маім рацыёне няма малочных прадуктаў і хлеба (за выключэннем прыгатаванага самой у хатніх умовах).

Сёння ў маім рацыёне — яйкі (на сняданак я звычайна ем пяць штук — два з жаўтком, астатнія толькі бялок), грэчка, рыс, курыца, індычка, рыба, агароднiна, аліўкавы і льняны алей. Магу з'есці хлебцы з сальцам *(усміхаецца)*.

***— На які ўзрост вы сябе адчуваеце?***

— На гады 23. Але дзень на дзень не прыходзіцца, бываюць моманты (праўда, вельмі рэдка), калі адчуваю сябе нават не на свае 38, а на ўсе 50.

***— Зараз вы працуеце фітнес-трэнерам, хто сёння звычайна прыходзіць у трэнажорную залу?***

— Людзі розных узростаў, вельмі матэанакіраваныя, якія ведаюць чаго хочуць па жыцці, а не толькі ў трэнажорнай зале, якія сочаць за сабой. Мае кліенты праследуюць розныя мэты — хтосьці пахудзець, падцягнуцца, хтосьці адпачыць, пагутарыць, але ў той жа час і атрымаць нейкую фізічную нагрузку. Часта трэнажорная зала — гэта проста даніна модзе. Раней модна было быць худой, ледзь не анарэксічнай, цяпер у модзе падмацаваныя дзяўчаты. Мне пішуць, што хочуць цела, як у мяне, а я папярэджваю, што, скінуўшы вагу, яе яшчэ трэба ўтрымаць, а гэта часам яшчэ больш складана. Да таго ж трэба разумець, што я, сілкуючыся грэчкай і рысам, шчаслівая, а вось ці будзеце з такой ежай шчаслівыя вы?

***— Што думаеце пра дзяўчат, якія прыходзяць у залу, як у рэстаран — нафарбаваныя з распушчанымі валасамі?***

— Я нармальна да гэтага стаўлюся. Так, не заўсёды дзяўчаты прыходзяць у трэнажорную залу па спорт, ну і выдатна, таму што ўсе хочуць знайсці маладога чалавека і ўдала выйсці замуж. А тут людзі, якія не ляжаць на канапе з півам і чыпсамі. Напэўна, гэта добры ход. Выдатна, калі дзяўчына прыгожая, дагледжаная, галоўнае, каб трэнажор доўга не займала *(смяецца)*.

**Фотаздымак са старонкі Дзіны ў сацсетках.**

# ГУЛЬНІ МУЖНЫХ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра старт новага сезона ў беларускім футболе, выступленні нашых спартсменаў на Параалімпіядзе-2018 і гульні беларускіх тэнісістак на турніры ў ЗША.**

**1. Святлана Саханенка перамагла ў лыжнай гонцы на 15 км вольным стылем** на Параалімпійскіх гульнях сярод спартсменак у катэгорыі B2 для атлетаў з парушэннямі зроку. На фінішы беларуска паказала вынік 49 хв. 11,7 сек. Для Святланы гэта ўжо другі медаль на гэтых Параалімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. Раней яна заваявала «бронзу» ў біятлоне, стаўшы трэцяй у спрынце на 6 км.

Другі сярэбраны медаль на Параалімпійскіх гульнях заваяваў беларус Юрый Голуб у лыжнай гонцы на 20 км у катэгорыі B3 для спартсменаў з парушэннямі зроку. Раней ён стаў другім у біятлоне ў спрынце на 7,5 км. У актыве беларускіх параалімпійцаў на зімовых Параалімпійскіх гульнях у Пхёнчхане ўжо 6 медалёў (1 залаты, 3 сярэбраныя, 2 бронзавыя), беларуская каманда займае дзявятае месца ў медальным заліку.

**2. Беларускі баксёр Кірыл Рэліх перамог у паядынку за званне чэмпіёна свету па версіі Сусветнай баксёрскай асацыяцыі (WBA).** Матч за тытул з кубінцам Рансесам Бартэлемі ў першай паўсярэдняй вазе да 63,5 кг адбыўся ў Сан-Антоніа.

Суддзі ў 12-раўндавым баі аддалі перавагу беларусу, які выйграў па ачках. У 2016-м Кірыл Рэліх ужо прымаў удзел у баі за тытул чэмпіёна, але тады саступіў брытанцу Рыкі Бернсу.

**3. Тры ўзнагароды заваявалі беларускія атлеты на Кубку Еўропы па лёгкаатлетычных кіданнях** у Партугаліі. Найбольш значнага поспеху дабілася беларуска Алёна Дубіцкая, якая ў штурханні ядра з вынікам 18 м 47 см заняла другое месца. Пераможцай стала вядомая венгерская спартсменка Аніта Мартан — 19 м 12 см.

Сярэбраны медаль у кіданні дыска сярод атлетаў да 23 гадоў (маладзёжная катэгорыя) заваяваў беларус Віктар Трус, які ўжо ў першай спробе адправіў снарад на 58 м 66 см.

Трэцюю ўзнагароду ў скарбонку беларускай каманды прынесла Ганна Тарасюк. У кіданні кап'я сярод спартсменак да 23 гадоў яна заняла другое месца — 56 м 48 см.

**4. Футбалісты брэсцкага «Дынама» ўпершыню сталі ўладальнікамі Суперкубка Беларусі,** на полі ФК «Мінск» яны перамаглі барысаўскі БАТЭ — 2:1. На 14-й хвіліне аўстрыйскі легіянер дынамаўцаў Сандра Готал упэўнена рэалізаваў пенальці — 1:0. Падапечныя Алега Дулуба кінуліся адыгрываць, аднак брастаўчане ўсё роўна імкнуліся дзейнічаць першым нумарам. Вынікам іх гульнявой пераваги стаў другі гол, які на 30-й хвіліне забіў Максім Вітус.

У другой палове сустрэчы каманда Радаслава Латала дзейнічала строга па ліку, аддаўшы ініцыятыву БАТЭ. Барысаўчане правялі шмат атак, але толькі ў самай канцоўцы, на 4-й кампенсаванай хвіліне, здолелі скараціць разрыў у ліку пасля ўдару Мікалая Сігневіча — 2:1.

Да гэтага ўладальнікамі Суперкубка Беларусі сем разоў станавіліся футбалісты БАТЭ (2010, 2011, 2013—2017), адзін раз трафей заваяваў «Гомель», які абыграў у 2012 годзе тых жа барысаўчан.

**5. Вікторыя Азаранка прайграла ў другім крузе адзіночнага разраду тэніснага турніру ў амерыканскім Індыян-Уэлсе.** Свой другі паядынак яна правяла няўдала, саступіўшы амерыканцы Слоан Стывенс — 1:6, 5:7. Раней яшчэ адна беларуская тэнісістка Арына Сабаленка прайграла ў 1/16 фіналу чэшцы Маркеце Вандроўшавай — 2:6, 2:6. Аляксандра Сасновіч у паядынку 3-га круга сустрэнецца з прадстаўніцай Даніі Каралін Вазняцкі. У мужчынскім парным разрадзе Максім Мірны і амерыканец Раян Харысан завяршылі выступленне, прайграўшы ў першым раўндзе галандска-румынскаму тандэму Жан-Жульен Роер / Хорыя Тэкау — 6:7 (5:7), 4:6.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «Белоруснефть-Особино»

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Площадь, кв. м | Цель использования |
|---|---|---|---|---|
| 1. Торговый объект площадью 477,9 кв. м с инвентарным номером 100/С-67139, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16, в целях использования для осуществления розничной торговли.<br>2. Оборудование:<br>– кондиционеры с инвентарными номерами согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 601140, 601141, 601142, расположенные по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16;<br>– система видеонаблюдения с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 601144, расположенная по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16;<br>– камеры холодильные «Полаир КХН-4» (4,4-М3) с инвентарным номером согласно инвентарной карточке учета объекта основных средств – 601147, 601156, 601166, расположенные по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16;<br>– сплит-системы KLS-220РФ4, (инв. № 601157), KMS-105 РФ4 (инв. № 601158, 601164, 601165), KMS-107 РФ4 (инв. № 601158, 601160), расположенные по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16;<br>– ванная моечная 1-гнездовая «Профи» цельнотянутая 600x700x860 (нерж. сталь AISI-430) (инв. № 601173) и ванны моечные 2-гнездовые «Профи» цельнотянутые 960x600x860 (нерж. сталь AISI-430) (инв. № 601174, 601178, 601179), расположенные по адресу: г. Брест, ул. Рябиновая, 16 | 1816,02 | 181,60 | 477,9 | Для осуществления розничной торговли |

Срок договора аренды не менее **трех лет**

| | |
|---|---|
| Условия | 1. С победителем аукционных торгов в течение 5 рабочих дней будет заключен договор аренды имущества.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| Реквизиты для перечисления задатка | РУП «Институт недвижимости и оценки». Брестский филиал р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 12 апреля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) – 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений – 11 апреля 2018 г. до 17.00**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества

| № лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
